СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 7.38, 17.10, 9.32;
Віцебск — 7.32, 16.56, 9.24;
Магілёў — 7.27, 16.59, 9.32;
Гомель — 7.21, 17.00, 9.39;
Гродна — 7.53, 17.26, 9.33;
Брэст — 7.49, 17.30, 9.41.

МЕСЯЦ:
Маладзік 3 лютага.

ІМЯНІНЫ:
Ігната, Лаўрэнція, Герасіма, Рамана, Якуба; Марыі, Люцыяны.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 40 кап.

ЛЮТАГА 1992 г.
аўторак, № 29 (21807)

РОЗГАЛАС

УВАГА: ФЕРМЕРЫ ІДУЦЬ!

ГОМЕЛЬ. З кожным днём усё больш людзей звязваюць свой лёс з фермерствам. Добра, што ў іх рады ўліваюцца тыя, хто мае нядрэнную тэарэтычную падрыхтоўку і немалы вопыт работы на зямлі. Сярод іх і старшыня калгаса «Камунар» Калінкавіцкага раёна Васіль Ціхоня, які падаў заяву аб выхадзе з гаспадаркі. Ён вяртаецца ў сваю родную вёску, дзе мясцовы калгас імя Калініна выдзеліў яму 200 гектараў зямлі, якую ён будзе апрацоўваць са сваімі сваякамі.

Фермерам вырашыў стаць і жыхар Светлагорска Васіль Тоўсцік. Ён будзе гаспадарыць на адведзеных яму землях саўгаса «Горкі», для чаго набыў трактар з прычэпам. Дарэчы, зараз фермеры, арандатары і сялянскія падворкі раёна маюць ужо каля 270 адзінак складанай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Радуе сваімі планамі на будучае і фермер са Жлобінскага раёна Уладзімір Ганчароў. Летась ён апрацоўваў 70 гектараў зямлі і атрымаў 200 тысяч рублёў прыбытку. Сёлета мае намер стварыць ферму на 70 галоў буйной рагатай жывёлы, узвесці склады, дом, розныя прыбудовы, для чаго ўзяў 1.200 тысяч рублёў крэдыту.

РЭДКІ ДЗЕНЬ АБЫХОДЗІЦЦА БЕЗ ДЫПЛАМАТЫЧНАГА ПРЫЗНАННЯ

Працягваецца дыпламатычнае прызнанне Рэспублікі Беларусь міжнародным супольніцтвам. Усё новыя краіны заяўляюць аб сваёй гатоўнасці ўстанавіць дыпламатычныя адносіны з Беларуссю. Рэдкі дзень за апошнія два-тры тыдні абыходзіцца без падпісання адпаведных дзяржаўных дакументаў.

Учора адбылося ўстанаўленне дыпламатычных адносін адразу з дзвюма краінамі. Раніцай—з Федэратыўнай Рэспублікай Бразіліяй. Яна яшчэ 26 снежня мінулага года прызнала суверэнітэт Рэспублікі Беларусь, аб чым без прамаруджвання было паведамлена ў Мінск праз бразільскае пасольства ў Маскве.

Крыху пазней, у панядзелак пасол па асобых даручэннях міністэрства замежных спраў Швейцарыі І. Бухер ад імя сваёй краіны падпісаў разам з міністрам замежных спраў Беларусі П. Краўчанкам пратакол аб устанаўленні дыпламатычных адносін. Трэба сказаць, што Швейцарыя адна з першых у свеце прызнала незалежнасць Беларусі. Пра што паведаміў летась яе віцэ-прэзідэнт Рэне Фельбер (цяпер ён з'яўляецца прэзідэнтам дзяржавы) у пісьме на імя Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі С. С. Шушкевіча.

Дарэчы, перад гэтым візітам у нашу рэспубліку швейцарскі бок выказаў пажаданне, каб членам дэлегацыі прадставілі магчымасць сустрэч у Мінску ў Міністэрствах фінансаў, аховы здароўя, па пытаннях экалогіі, у Камітэце па знешніх эканамічных сувязях. У Беларусі з разуменнем аднеслася да просьбы швейцарцаў, бо ў нашых інтарэсах паглыбляць супрацоўніцтва з адной з самых развітых заходнееўрапейскіх краін, вядомай сваімі дасягненнямі ў розных галінах. Усталяванню больш цесных кантактаў будуць садзейнічаць Дні Беларусі ў швейцарскім кантоне Аргау, якія пройдуць гэтай вясной.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ПАСЯДЖЭННЕ САВЕТА КІРАЎНІКОЎ УРАДАЎ СНД:

МЕСЦА ДЛЯ АПТЫМІЗМУ ЎСЁ Ж ПАКУЛЬ ШТО ЁСЦЬ

Завяршылася ў Маскве пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў дзяржаў—членаў Садружнасці. Першыя вынікі гэтага пасяджэння — падпісанне пяці дакументаў, якія акрэсліваюць узаемадзеянне рэспублік Садружнасці ў галіне эканомікі.

Першае, што хацелася б адзначыць, гэта адсутнасць подпісу Украіны на ўсіх гэтых дакументах. Ці то адыграў сваю ролю Чарнаморскі флот, ці то Краўчук яшчэ не вызначыўся канчаткова са сваёй тактыкай у рамках СНД. Ва ўсякім разе, дэлегацыя Украіны мела толькі дарадчы голас. Затое пачынае падключацца да СНД Грузія.

Цяпер непасрэдна аб падпісаных дакументах. Шмат дыскутавалася аб цэнтралізаванай куплі па імпарту прадуктаў харчавання, сельскагаспадарчай сыравіны, матэрыялаў і сродкаў аховы раслін за замежныя крэдыты. Расія выступіла гарантам гэтых крэдытаў, дзевяць дзяржаў СНД і Грузія падтрымалі яе. Украіна зноў заняла самастойную пазіцыю, якая выражаецца ў самастойных дамоўленасцях з замежнымі крэдыторамі. Далей. Удзельнікі пасяджэння даручылі Міждзяржаўнаму экалагічнаму савету правядзенне ўзгодненай палітыкі ў галіне экалогіі і аховы навакольнага прыроднага асяроддзя, а таксама распрацоўку праграм экалагічных экспертыз і г. д.

Удзельнікі дамовіліся стварыць і падтрымліваць спецыяльныя сілы і сродкі, неабходныя для папярэджання экалагічных катастроф, аварый і ліквідацыі іх вынікаў, а таксама развіваць адзіную энергетычную сістэму з дапамогай новаўтворанага Электраэнергетычнага савета.

Падпісана пагадненне і аб парадку транзіту на тэрыторыі дзяржаў — членаў СНД тэрмінам на 5 гадоў. Яно фактычна ўстанаўлівае спецыяльны бесперашкоднага праходжання грузаў. Украіна зноў прапанавала свой варыянт рэгулявання транзітных перавозак — з кантролем і аплатай пры перасячэнні яе мяжы, але ён не быў прыняты.

Прыняты пратакол аб павелічэнні тарыфаў у міждзяржаўных зносінах — на чыгуначныя грузавыя перавозкі ў 8,5 раза, пасажырскія — у 3 разы ў параўнанні з тарыфамі, якія дзейнічалі да 31 снежня 1991 года.

Наступнае пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў Садружнасці павінна адбыцца 13 сакавіка таксама ў Маскве.

ЛЮДЗІ І ЦЭНЫ

НЕКАЛЬКІ НАЗІРАННЯЎ ЧАСОЎ УСЕАГУЛЬНАЙ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫІ І КУПАНІЗАЦЫІ

Стракаты кіёск з намаляванымі яблыкамі, гарбузамі і вішнямі: гандлююць ягаднінай. Праўда, не яблыкамі ці гарбузамі (сваё ж трэба вырасціць, дагледзець, напрацавацца), а заморскімі экзотамі: лімонамі і мандарынамі. Па адпаведных, вядома, цэнах. Лімончык 12 рублёў у сярэднім атрымліваецца. Але ж куды дзенешся: не натрасеш іх, як дзічкаў ва ўраджайны год. Бяруць хто па два, хто па тры, пільна аглядаючы кожны. Прывычныя ў такіх выпадках інцыдэнты:

— Памяняйце вось гэты. Бачыце, гнілы.

— Які гнілы? Крыху прыцісніты. Ідзіце на базары выбірайце. Мне тавар трэба прадаць. Не падабаецца — адыходзьце. Я вас сюды не клікала.

— Хутчэй бы ваш час скончыўся, гандляроў. Ну, хіба нельга па-чалавечы пагаварыць?

— Наш час не скончыцца, не дачакаецеся. Хутчэй ваш скончыцца. Будзьце ўпэўнены.

Сумна, але ж, напэўна, праўда: хутчэй за ўсё не скора скончыцца.

●

Бабулька намерваецца купіць два з палавінай метры прыгожай цыраты, што нечакана з'явілася ва універмагу.

— Гэта мне якраз хопіць на стол і ўсе шкапчыкі перасцяліць, — дзеліцца прыемнымі клопатамі з прадаўшчыцамі.

— Бабуля, а вы цану ведаеце?

— Так, дачушка, 12 рублёў, я ж бачу. Дарагавата, але ж вазьму. Старая ўся патрэскалася.

Немаладая прадаўшчыца са спачуваннем (!) глядзіць на бабулю, марудзячы з прысудам. Старая акуратна раскладвае на прылаўку грошы і купоны. Метр цыраты каштуе 121 рубель. Бабулінай пенсіі, як высвятляецца, засталося крыху за сотню. Наступная—у канцы месяца.

Бабуля плача. Упершыню ў жыцці адчула сябе багатай — 350 рублёў дзяржава адваліла, ці ж не гонар? Шчасце аказалася непрацяглым...

●

Да Новага года — лічаныя дні, таму ў аддзел з цацкамі для ялінкі адзін за адным бягуць запозненыя пакупнікі. Вітрына зіхаціць: многа-многа бліскучых шароў, чырвоных і жоўтых. Пашанцавала! Але радасць хвілінная. Кідаецца ў вочы аб'ява: «Норма водпуску —па дзве цацкі кожнага віду». А ўсіх відаў, як сказана вышэй,—два. Значыць, па чатыры штукі на рукі (во, эмаль паэзія).

У дзяцей карагод вакол ёлкі пачнецца праз некалькі дзён, а дарослыя цёткі і дзядзькі ўсчалі яго датэрмінова, дарма што за рукі не пабраліся: атрымаў чатыры штукі—зноў у хвост чаргі. Так і ходзяць кругамі. Чым не свята! Так што дарэмна мы толькі дрэннае бачым у нашых правілах гандлю. Дзе яшчэ так паводзілі б карагоды?

●

У нашым Доме ўрада, калі хто не ведае, грандыёзнасці самога дома адпавядаюць не менш унушальныя і бясконцыя калідоры, што вядуць да ўсемагчымых буфетаў, майстэрань, сталовак. За адзін раз і не запомніш дарогу. Неяк кружыла ў пошуках якой-небудзь харчкропкі і натрапіла на даволі элегантны буфет — з нацыянальнымі сурвэткамі, вітрынай з чорнага дрэва, што-нішто, здаецца, вісела на сценах, сцвярджаючы мастацкі густ тых, хто працаваў над інтэр'ерам. Асартымент страў у цяжкіх салідных папках.

Але надзея на хуткі перакус не апраўдалася: прывезлі нейкі не апазнаны мною (але на выгляд вельмі прывабны!) харч у вялікіх кантэйнерах, і дзесяткі са два чалавек хуценька пасталі ў чаргу. Стала і я: чарга чаргой, а полудзень па раскладу. Можа і дэфіцыту якога перападзе.

Праз хвілін колькі, за мной становіцца спадар сярэдніх гадоў і тут жа ўступае ў гаворку:

— Што даюць? Карбанат? Бужаніну? Вам лепш відаць, падкажыце.

Бачу, кажу, але ж не ведаю, што гэта такое. Ну, мяса, відаць вэнджанае, са спецыямі. Каштуе 18 рублёў (тады яшчэ, у пачатку зімы, цэны былі ніжэйшымі).

Ён, гэты спадар, уважліва так на мяне глядзіць, зайшоўшы крыху наперад.

— У вашым узросце,—кажа,—трэба было б ужо і разбірацца.

Мне толькі і засталося сказаць у сваё апраўданне нешта накшталт розніцы паміж каўбаскамі па-магілёўску і тэфтэлямі, якія іншы раз гатуюць у нашай домадрукаўскай сталоўцы.

Пасля гэтага доўга перажывала за тую заўвагу. Не ведаю, што закранула больш: ці згадка пра ўзрост, ці ўласная недасведчанасць ва ўсіх гэтых мясных далікатэсах? З узростам, вядома, нікуды не дзенешся, спадзяваюся на лепшае не выходзіць, а вось з расшырэннем кругагляду наконт гастранамічных тонкасцей нашай мясной прамысловасці надзей не губляю: убачылі ж пасля павышэння цэн і ўсялякія рулеты, і каўбасы, і нават тую

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА 1992 ГОД

Паказчыкі Дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь на 1992 год распрацаваны ў адпаведнасці з рашэннямі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб палітычнай і эканамічнай самастойнасці рэспублікі як суверэннай дзяржавы, асноўнымі палажэннямі рэспубліканскай праграмы па пераходу да рынкавых адносін і Пагадненняў, заключаных ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў па бюджэтна-фінансавых пытаннях. Даходы і расходы бюджэту вызначаны зыходзячы з прагнозных ацэнак фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, узроўню змянення цэн, падатковага заканадаўства, якое ўводзіцца ў дзеянне з 1 студзеня 1992 года, перадачы ва ўласнасць Рэспублікі Беларусь прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый і ўстаноў былога саюзнага падпарадкавання, размешчаных на тэрыторыі рэспублікі. У разліках да бюджэту прадугледжана павелічэнне асігнаванняў на фінансаванне сацыяльна-культурных устаноў і мерапрыемстваў па сацыяльнай абароне малазабяспечаных слаёў насельніцтва ва ўмовах пераходу да рынкавых адносін.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Артыкул 1. Устанавіць, што гранічныя размеры дэфіцытаў бюджэтаў усіх узроўняў Рэспублікі Беларусь на 1992 год не могуць перавышаць 6 працэнтаў ад аб'ёму бюджэту па расходах.

Разліковыя размеры дэфіцытаў кансалідаваных мясцовых бюджэтаў абласцей і горада Мінска прадстаўляюцца выканаўчымі камітэтамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у 10-дзённы тэрмін пасля зацвярджэння бюджэтаў першапачатковага тэрытарыяльнага ўзроўню.

Артыкул 2. Устанавіць, што даходы рэспубліканскага бюджэту на 1992 год фарміруюцца за кошт:

адлічэнняў ад акцызаў у размеры 70 працэнтаў;

адлічэнняў ад падатку на прыбытак (даходы) прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый (акрамя тых, якія ўваходзяць у склад камунальнай уласнасці, грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў і арганізацый спажывецкай кааперацыі, іншых кааператываў, а таксама іншых прадпрыемстваў і арганізацый мясцовай гаспадаркі, што ўплачваюць гэты падатак поўнасцю ў мясцовыя бюджэты) у размеры 50 працэнтаў;

адлічэнняў ад падатку на дабаўленую вартасць (за выключэннем перадаваемых у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска ў размерах, зацверджаных артыкулам 12 пункта «в» гэтага Закона);

паступленняў сродкаў ад рэалізацыі аблігацый Беларускай рэспубліканскай беспрацэнтнай пазыкі;

падатку на нерухомасць прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, якія адносяцца да рэспубліканскай уласнасці, прадпрыемстваў і арганізацый іншых форм уласнасці, за выключэннем прадпрыемстваў і арганізацый, якія выплачваюць гэты падатак у мясцовыя бюджэты;

падатку і даходу ад знешнеэканамічнай дзейнасці і падатку на паліва;

платы за зямлю (акрамя зямель гарадоў) у размеры 25 працэнтаў і платы за зямлю гарадоў у размеры 40 працэнтаў;

надзвычайнага падатку на фонд аплаты працы прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый для правядзення мерапрыемстваў па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

паступленняў ад пераацэнкі астаткаў тавара-матэрыяльных каштоўнасцей;

іншых падатковых і непадатковых паступленняў ад дзейнасці прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый рэспубліканскай уласнасці і іншых форм уласнасці, за выключэннем прадпрыемстваў і арганізацый, якія выплачваюць гэтыя плацяжы ў мясцовыя бюджэты.

Артыкул 3. Устанавіць, што сродкі рэспубліканскага бюджэту накіроўваюцца ў 1992 годзе на забеспячэнне функцыянівання і развіцця галін народнай гаспадаркі, якія знаходзяцца ў кіраванні рэспубліканскіх органаў, на фінансаванне фундаментальных даследаванняў і тэхнічных распрацовак, сацыяльна-культурных мерапрыемстваў агульнарэспубліканскай значнасці і сацыяльнай абароны насельніцтва, на ўтрыманне праваахоўных органаў, органаў дзяржаўнай бяспекі, судовых органаў, абароны, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнай улады і кіравання, стварэнне неабходных фінансавых рэзерваў агульнарэспубліканскага значэння.

Артыкул 4. У выпадку выдання заканадаўчых актаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рашэнняў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў або іх выканаўчых органаў, якія выклікаюць павелічэнне расходаў або памяншэнне даходаў ніжэйстаячых бюджэтаў, гэтым бюджэтам пакрываюцца сродкі з вышэйстаячага бюджэту.

Пры прыняцці мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў і іх выканаўчымі органамі рашэнняў, якія выклікаюць памяншэнне даходаў або павелічэнне расходаў вышэйстаячых бюджэтаў, гэтым бюджэтам пакрываюцца сродкі за кошт адпаведных мясцовых бюджэтаў.

Артыкул 5. Зацвердзіць рэспубліканскі бюджэт на 1992 год па даходах у суме 52882,8 млн. рублёў.

Артыкул 6. Устанавіць даходы рэспубліканскага бюджэту на 1992 год:

	(млн. рублёў)
Акцызы	9904,0
Падатак на прыбытак (даходы) прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый	8341,9
Падатак на дабаўленую вартасць	22154,4
Падатак на нерухомасць	1576,6
Паступленні ад рэалізацыі аблігацый Беларускай рэспубліканскай беспрацэнтнай пазыкі	97,0
Надзвычайны падатак для ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС	7224,3
Падаткі і даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці	60,0
Падатак на паліва	1019,2
Плата за зямлю	1022,4
Паступленні ад пераацэнкі астаткаў тавара-матэрыяльных каштоўнасцей	650,0
Іншыя даходы, падаткі і паступленні	833,0

Артыкул 7. Зацвердзіць гранічны ўзровень дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту на 1992 год у суме 3510,5 млн. рублёў.

Артыкул 8. Зацвердзіць абаротную касавую наяўнасць па рэспубліканскаму бюджэту на 1 студзеня 1993 года ў суме 375,0 млн. рублёў.

Артыкул 9. Зацвердзіць рэспубліканскі бюджэт на 1992 год па расходах у суме 56393,3 млн. рублёў.

Артыкул 10. Устанавіць у рэспубліканскім бюджэце на 1992 год асігнаванні на:

	(млн. рублёў)
Фінансаванне народнай гаспадаркі	7322,8
у тым ліку на:	
дзяржаўныя капітальныя ўкладанні гаспадарчаразліковых прадпрыемстваў і арганізацый, уключаючы расходы на перапрафіляванне і канверсію вытворчасці	1512,0
дзяржаўную субсідыю сельскагаспадарчым прадпрыемствам і сялянскім (фермерскім) гаспадаркам (на меліярацыю, будаўніцтва ўнутрыгаспадарчых дарог і іншыя расходы па гаспадарчаму добраўпарадкаванню)	3500,0
дзяржаўную датацыю і папаўненне гаспадарчаразліковых фондаў планава-стратным прадпрыемствам і арганізацыям	167,3
аперацыйныя расходы	730,5
геолагаразведачныя работы	166,9
капітальны рамонт будаўніцтва, рамонт і ўтрыманне аўтамабільных дарог, уключаючы ўнутрыгаспадарчыя дарогі (за кошт паступлення сродкаў па падатку на паліва)	1019,2
іншыя расходы	215,3
Фінансаванне сацыяльна-культурных устаноў і мерапрыемстваў па сацыяльнай абароне насельніцтва	17065,1
у тым ліку на:	
народную адукацыю і падрыхтоўку кадраў	4575,4
культуру і сродкі масавай інфармацыі	611,6
ахову здароўя	2680,9
фізічную культуру	91,5
мэтавыя кампенсацыі дадатковых расходаў насельніцтва, якія выклікаюцца змяненнем рознічных цэн на мяса і масла жывёльнае	85,7
сацыяльнае забеспячэнне	5744,4
розніцу ў цэнах на тавары і паслугі, на якія ўстаноўлены фіксаваныя цэны	2764,2
дзяржаўныя капітальныя ўкладанні на жыллёвае будаўніцтва	311,4
Фінансаванне навукі	1516,1
Утрыманне органаў Міністэрства ўнутраных спраў (уключаючы ўнутраныя войскі)	2532,0
Утрыманне судовых органаў	110,6
Утрыманне органаў пракуратуры	114,6
Утрыманне Міністэрства абароны, Камітэта дзяржаўнай бяспекі і іх падраздзяленняў	793,8
Расходы, звязаныя са знешнеэканамічнай дзейнасцю	278,0
Расходы па выпуску нацыянальнай валюты і каштоўных папер	808,0
Утрыманне органаў дзяржаўнай улады і кіравання	469,8
Рэзервовы фонд Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь	554,0
Рэзерв міністра фінансаў	11,0
Рэспубліканскі фонд стабілізацыі эканомікі	800,0
Расходы па абслугоўванню дзяржаўнага ўнутранага доўгу	158,6
Расходы, звязаныя з паэтапнай лібералізацыяй цэн	2300,0
Іншыя расходы	832,8
Сродкі для павелічэння абаротнай касавай наяўнасці	125,0
Расходы на індэксацыю даходаў насельніцтва	1000,0
Сродкі, якія накіроўваюцца на фінансаванне абароны	8000,0
Расходы па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС	10784,3
Расходы на выплату працэнтаў па знешняму доўгу	270,0
Сродкі, якія перадаюцца мясцовым бюджэтам асобных абласцей па ўваежных разліках для давядзення бюджэтнай забеспечанасці на аднаго жыхара да сярэднерэспубліканскага ўзроўню	546,8

Артыкул 11. Устанавіць на 1992 год сярэднерэспубліканскі нарматыў бюджэтнай забяспечанасці на аднаго жыхара для вызначэння мінімальнага памеру мясцовых бюджэтаў у суме 3846 рублёў. Для давядзення нарматыву бюджэтнай забяспечанасці да сярэднерэспубліканскага ўзроўню павялічыць асігнаванні па мясцовых бюджэтах на агульную суму 546,8 млн. рублёў, у тым ліку па мясцовых бюджэтах Брэсцкай вобласці —285,1 млн. рублёў, Віцебскай вобласці—183,4 млн. рублёў і Мінскай вобласці — 78,3 млн. рублёў. З улікам гэтага ўстанавіць на 1992 год нарматыў бюджэтнай забяспечанасці на аднаго жыхара па мясцовых бюджэтах Брэсцкай вобласці, Віцебскай вобласці і Мінскай вобласці ў размеры 3846 рублёў, Гомельскай вобласці — 3907 рублёў, Гродзенскай вобласці —3889 рублёў, Магілёўскай вобласці — 3936 рублёў і горада Мінска—4019 рублёў.

Артыкул 12. Устанавіць на 1992 год нарматывы адлічэнняў (у працэнтах) у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска:

а) ад акцызаў—30;

б) ад падатку на прыбытак (даходы) прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый (акрамя тых, якія ўваходзяць у склад камунальнай уласнасці, грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў і арганізацый спажывецкай кааперацыі, іншых кааператываў, а таксама іншых прадпрыемстваў і арганізацый мясцовай гаспадаркі, што выплачваюць гэты падатак поўнасцю ў мясцовыя бюджэты)—50;

в) ад падатку на дабаўленую вартасць: у мясцовыя бюджэты Брэсцкай вобласці — 49,4; Віцебскай вобласці—29,7; Гомельскай вобласці — 37,8; Гродзенскай вобласці — 50,4; Мінскай вобласці — 61,5; Магілёўскай вобласці — 35,8 і горада Мінска—19,2;

г) ад паступленняў па рэалізацыі аблігацый рэспубліканскай 5-працэнтнай унутранай пазыкі—100;

д) ад платы за зямлю (акрамя зямель гарадоў)—75, платы за зямлю гарадоў—60.

Падатак на нерухомасць, які выплачваецца прадпрыемствамі, аб'яднаннямі і арганізацыямі камунальнай уласнасці, грамадскімі арганізацыямі, прадпрыемствамі і арганізацыямі спажывецкай кааперацыі, іншымі кааператывамі, а таксама іншымі прадпрыемствамі і арганізацыямі мясцовай гаспадаркі, фізічнымі асобамі, поўнасцю залічваецца ў мясцовыя бюджэты.

Артыкул 13. Устанавіць ліміт удзелу Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь у крэдытаванні бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь у памерах не больш двух працэнтаў ад валавога нацыянальнага прадукту.

Артыкул 14. Устанавіць, што Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь і камерцыйныя банкі ажыццяўляюць размеркаванне і залічэнне даходаў і падаткаў у рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты ў адпаведнасці з нарматывамі, зацверджанымі Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў. Размеры адлічэнняў ад падаткаў і даходаў у адпаведныя бюджэты штогод паведамляюцца ўстановам банкаў Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і мясцовымі фінансавымі органамі.

Артыкул 15. Устанавіць на 1992 год надзвычайны падатак у памерах 18 працэнтаў ад фонду аплаты працы ўсіх прадпрыемстваў, аб'яднанняў і гаспадарчых арганізацый, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (за выключэннем калгасаў, саўгасаў, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак), з аднясеннем яго на сабекошт прадукцыі, работ і аказваемых паслуг і накіраваннем сумы гэтага падатку на фінансаванне мерапрыемстваў па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі.

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь устанавіць парадак выплаты надзвычайнага падатку прадпрыемствамі, аб'яднаннямі і арганізацыямі.

Артыкул 16. Зацвердзіць у адпаведнасці з артыкулам 5 (пункт 2, падпункт «з») Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый» на 1992 год пералік грамадскіх фондаў, арганізацый і асацыяцый, якія ажыццяўляюць дабрачынную, экалагічную і аздараўленчую дзейнасць, унесены прыбытак якім выключаецца з абкладаемага падаткам прыбытку прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый.

Артыкул 17. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

а) у працэсе выканання бюджэту прымаць практычныя меры па скарачэнню дэфіцыту бюджэту за кошт прыцягнення дадатковых даходаў прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый і насельніцтва, эканоміі ў расходаванні сродкаў. Па пытаннях, якія патрабуюць рашэння Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, уносіць адпаведныя прапановы;

б) улічваючы, што ў працэсе выканання бюджэту на 1992 год ва ўмовах пераходу да рынкавых адносін і лібералізацыі аптовых, закупачных і рознічных цэн магчымы істотныя адхіленні як па даходах, так і па расходах рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў абласцей і горада Мінска супраць іх аб'ёмаў, улічаных у разліках да бюджэту, уносіць у адпаведнасці з прадастаўленымі правамі ўдакладненні даходаў і расходаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў абласцей і горада Мінска ў межах фінансавых рэсурсаў, якія складаюцца ў цэлым па рэспубліцы;

(Заканчэнне на 2-й стар.).

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб скліканні дзевятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Склікаць дзевятую сесію Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання 11 сакавіка 1992 года ў горадзе Мінску.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

10 лютага 1992 г.
г. Мінск.

Творчыя саюзы папярэджваюць...

У гаротным стане ва ўмовах «дзікага» рынку, які ўсё больш і больш ахоплівае наша жыццё, апынулася беларуская нацыянальная культура. Да матэрыяльнай неўладкаванасці, запушчанасці, прафесійнай неабароненасці, чым «вызначалася» жыццё нашых мастакоў і кампазітараў, скульптараў і дызайнераў, артыстаў і архітэктараў, пісьменнікаў і журналістаў, кінематаграфістаў і тэатральных дзеячаў, яшчэ зусім нядаўна неспадзявана дабавіўся Закон аб падатках, прыняты на нядаўняй сесіі парламента рэспублікі. Пазнаёміўшыся з ім, цвяроза ацаніўшы свае магчымасці і тыя ўмовы, у якія ставяць творчых людзей заканадаўцы, у творчых саюзах Беларусі прыйшлі да высновы: надышоў час іх прымусовай ліквідацыі...

Аб усіх бядотах і неўладкаванасці жыцця і дзейнасці творчай інтэлігенцыі ішла ўчора зацікаўленая і разам з тым—усхваляваная і трывожная размова на аб'яднаным пленуме творчых саюзаў і грамадскіх фондаў Беларусі. Утвораны Камітэт абароны культуры рэспублікі, прынята рэзалюцыя пленума.

(Падрабязная справаздача з пленума будзе апублікавана ў адным з наступных нумароў «Звязды»).

Абдзяліла прырода—папрацуем самі

БЯГОМЛЬ. (М. Аўтух). Магчыма, нехта палічыў дырэктара камбіната будаўнічых матэрыялаў Уладзіміра Лук'яненку і старшыню мясцовага пасялковага Савета Сяргея Лапчыка вялікімі фантазёрамі, калі яны прапанавалі жыхарам і дэпутатам свой праект стварэння штучнага возера ў межах гарпасёлка плошчай 32 гектары.

Не чакаючы, пакуль праекціроўшчыкі складуць праект, абодва бакі дамовіліся, што расходы на будаўніцтва будуць падзелены пароўну. Дырэкцыя камбіната адкамандзіравала для работ спецыялістаў і неабходную тэхніку. Паабяцалі дапамагчы і іншыя кіраўнікі — возера патрэбна ўсім. Зараз вядуцца земляныя работы.

Кіраўнікі за партамі

ЛІДА. (А. Дук). На заводзе «Оптык» пачалася вучоба ў бізнес-клубе кіраўнікоў, галоўных спецыялістаў прадпрыемства, начальнікаў цэхаў і аддзелаў.

Заняткі па тэме «Менеджмент, маркетынг, прадпрымальніцтва і бізнес ва ўмовах рынку» правёў дацэнт Маскоўскай агрэгарнай акадэміі М. Салаўёў. Ён раскрыў галоўныя аспекты прадпрымальніцкай дзейнасці, правёў дзелавыя гульні «Банк», «Выбар кіраўніка, прадпрымальніка», «Канкурэнтаздольнасць».

Вучоба — ініцыятыва дырэктара «Оптыка» А. Белавуса і гарадской арганізацыі таварыства «Веды».

На Лідскай абутковай фабрыцы пачаў дзейнічаць падобны бізнес-клуб.

Валерый МЯЛЕШКА: «Сацыяльнае забеспячэнне не церпіць скупасці і пустых абяцанняў...»

ПЕРШАЕ ІНТЭРВ'Ю НА НОВАЙ ПАСАДЗЕ

Пенсіённае забеспячэнне — гэта якраз тая сфера, без якой раней ці пазней не абыдзецца ніхто з нас. У снежні мінулага года створаны Пенсіённы фонд Рэспублікі Беларусь. Яго ўзначаліў Валерый Уладзіміравіч Мялешка.

Вось візітная картка старшыні яго праўлення. Нарадзіўся ў 1940 годзе ў г. Мінску. Беларус. Сацыяльнае паходжанне — з рабочых. Працоўную дзейнасць пачаў рабочым на заводзе імя Вавілава. Закончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі. Затым працаваў у Бярэзінскім раённым і Мінскім абласным фінаддзелах. Са жніўня 1976 па лістапад 1988 года быў начальнікам аддзела і ўпраўлення ў Міністэрстве сацыяльнага забеспячэння рэспублікі. Перад назначэннем на цяперашнюю пасаду — кіраўнік Беларускага рэспубліканскага аддзялення Пенсіённага фонду СССР.

Жанаты, мае двое дзяцей.

— Есць Міністэрства сацыяльнага забеспячэння рэспублікі. Чым тады выклікана стварэнне Пенсіённага фонду?

— Адразу хачу зазначыць, што падобных пытанняў, размоў, выказванняў, нават дыскусій у сродках масавай інфармацыі, на жаль, хапае. Усё гэта вынік таго, што ў нас нярэдка эмоцыі, недасведчанасць і проста дылетанцтва бяруць верх над разумным сэнсам, асабліва ў такой складанай і надзвычай чуйнай галіне, як сацыяльная абароненасць і забеспячэнне чалавека.

Ніякага веласіпеда тут мы не вынаходзілі і ніякай новай бюракратычнай структуры, як спрабуюць гэта паказаць, мы не стварылі. Ва ўсім цывілізаваным свеце, у многіх краінах даўно існуюць і дзейнічаюць пенсіённыя фонды. Аб іх сутнасці, ролі і значэнні гаворыць ужо сама назва.

Галоўная асаблівасць Пенсіённага фонду ў тым, што ён з'яўляецца **самастойнай**, падкрэслю — **самастойнай фінансава - банкаўскай сістэмай, сродкі якой не ўваходзяць у бюджэт рэспублікі.** Праўда, гэта зусім не значыць, што сродкі яго не выкарыстоўваюцца на фінансаванне сацыяльных патрэб грамадства.

— Якія ж асноўныя задачы фонду?

— Спачатку трэба мець на ўвазе, што ён з'яўляецца дзяржаўнай уласнасцю Рэспублікі Беларусь, здабыткам грамадства. Галоўная ж мэта нашага фонду — акумуляцыя грашовых сродкаў на рэспубліканскім узроўні на аснове цэнтралізаванай сістэмы кіраўніцтва фінансамі пенсіённага прызначэння і такім чынам забеспячэнне надзейных гарантый па выплаце пенсій і дапамог грамадзянам, якім яны належаць па заканадаўству.

— Калі ласка, каму канкрэтна?

— Спектр выплат даволі шырокі. Перш-наперш людзям, якія дасягнулі пенсіённага ўзросту або страцілі працаздольнасць. Затым па догляду дзіцяці да 3 гадоў і на дзяцей ад 3-х да 16-ці гадоў (навучэнцам, якія не атрымліваюць стыпендыі, — да 18-ці. А таксама навучэнцам агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў звыш 18-гадовага ўзросту). У нашым бюджэце прадугледжаны выдаткі, праз органы сацыяльнага забеспячэння, на аказанне матэрыяльнай дапамогі непрацуючым пенсіянерам.

— Калі Вы загаварылі аб бюджэце фонду, то цікава было б ведаць, за кошт чаго, якім чынам ён стварэецца і папаўняецца?

— Грошы на сацыяльныя патрэбы, як міфічная манна, з неба не сыплюцца. Сродкі на такія мэты заўсёды і ўсюды бяруцца з тых, хто працуе і іх зарабляе. Наша былая «магутная і небасяжная» дзяржава таксама чэрпала іх з працоўных калектываў. Іншая справа — як гэта рабілася і куды ішлі гэтыя велізарныя зборы. А яны (без нашага ведама) пералічваліся ў дзяржбюджэт, грамадскія фонды спажывання, адным словам «звальваліся» ў агульны кацёл. А ўжо з яго па заганнаму астаткаваму прынцыпу вярталіся народу ў выглядзе мізэрных пенсій і дапамог.

Пенсіённы фонд для таго і з'явіўся, каб ліквідаваць гэту несправядлівасць.

А цяпер за кошт чаго ствараецца бюджэт нашага фонду? У першую чаргу са страхавых узносаў прадпрыемстваў і арганізацый, якія ўстаноўлены Вярхоўным Саветам рэспублікі ў размеры 40,8 працэнта ад фонду заработнай платы. Паступаюць таксама 1-працэнтныя адлічэнні з заработку (даходу) рабочых і служачых, сродкі рэспубліканскага бюджэту, што выдзяляюцца на выплату пенсій ваеннаслужачым тэрміновай службы, сем'ям загінуўшых і дапамог на дзяцей, узрост якіх больш трох гадоў. І, зразумела, за кошт добраахвотных ахвяраванняў працоўных калектываў, насельніцтва рэспублікі, замежных грамадзян, за што шчырае ўсім дзякуй.

— Скажыце, Валерый Уладзіміравіч, ці не прывядзе цэнтралізаванае кіраўніцтва пенсіённымі фінансамі да славутай ураўнілаўкі ў сацыяльным забеспячэнні людзей? Магчыма, у нейкім горадзе ці вобласці захочуць мець уласны фонд?

— Наш фонд забяспечвае фінансаванне выплат пенсій і дапамог больш чым пяці мільёнам чалавек. І ў тым, што мы ўзялі на сваё абслугоўванне такую колькасць людзей, галоўная заслуга створанага бюджэту. А ён, як кажуць, адзіны, «непадзельны» і закліканы забяспечваць гарантаваныя выплаты матэрыяльных дапамог у любым рэгіёне рэспублікі. А больш дакладна, у гарадах, абласцях і раёнах незалежна ад таго, з'яўляюцца яны самафінансуемымі ці не. І гэта, пагадзіцеся, ніякая не ўраўнілаўка, а забеспячэнне законных правоў кожнага на пенсію, жыве ён у сталіцы ці вёсцы, з'яўляецца рабочым, калгаснікам ці служачым.

Так, ёсць памкненні стварыць уласныя пенсіённыя фонды, скажам, г. Мінска, абласцей, дзе стабільная, моцная эканоміка. Але, прабачце, уся ж рэспубліка, усё грамадства стваралі матэрыяльныя каштоўнасці, удасканальвалі інфраструктуру таго ж Мінска ці заможнай вобласці. А цяпер, значыць, падзелім пенсіі на мінскія, брэсцкія ці, больш таго, адасобім гомельскія, магілёўскія, дзе людзі яшчэ і пацярпелі ад чарнобыльскай бяды. Зразумела, гэта было б у корані няправільна і несправядліва.

І ў бюджэце ПФ прадугледжаны сродкі на датацыі абласцям і раёнам са слабай эканомікай для поўнага і бесперапыннага фінансавання пенсіённых выплат. Захаванне яго пастаяннай надзейнасці, стварэнне страхавых запасаў грашовых сродкаў неабходна на выпадак непрадбачаных абставін, якія могуць запатрабаваць дадатковых і значных выдаткаў.

Час падкінуў нам і такую праблему. Сацыяльна абароненым павінен быць і той, хто сваёй працай унёс пэўны ўклад у здабыткі рэспублікі, але па волі лёсу апынуўся за яе межамі. Безумоўна, пытанне гэта надзвычай складанае, і яго можна і трэба вырашаць толькі ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

А што датычыцца ўласных страхавых фондаў, то, калі ласка, няхай ствараюць і дапамагаюць людзям, якія маюць у гэтым патрэбу. Аднак адлічэнні ў наш фонд павінны быць на першым плане — яны абавязковыя.

— Што і казаць, «гаспадарка» Ваша турботная і складаная. Натуральна, для кіравання ёю ёсць апарат. Які яго штат, што ён сабой уяўляе, чым займаецца?

— Праўленне з'яўляецца калектыўным гаспадаром — размеркавальнікам ПФ. У яго саставе увайшлі прадстаўнікі Дзяржкампрацы, міністэрстваў фінансаў і сацыяльнага забеспячэння, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, начальнікі нашых абласных упраўленняў.

У так званым цэнтральным апараце замест 36 па штату працуюць фактычна 17 чалавек. Мясцовыя органы такія: Мінскае гарадское і абласныя ўпраўленні, плюс іх упаўнаважаныя. У сярэднім па адным (у буйных — па два) на раён. Усяго па штатнаму раскладу ў нас павінна быць 510 спецыялістаў, а працуе 420. Затраты на іх утрыманне летась склалі 0,1 працэнта ад агульнай сумы паступленняў страхавых узносаў, або каля 9 мільёнаў рублёў. Для параўнання скажу, што толькі за дастаўку пенсій аддзяленні сувязі з нас бяруць больш за мільярд рублёў.

Але варта глядзець і наперад. Наш пастаянны клопат — умацаванне і папаўненне бюджэту, рацыянальнае, ашчаднае, але не скупое і справядлівае яго выдаткаванне пры самым строгім кантролі. Толькі пры такім падыходзе можна гаварыць аб удзеле Пенсіённага фонду ў далейшым развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыяльнага забеспячэння рэспублікі. А спраў тут непачаты край—будаўніцтва і рэканструкцыя дамоў-інтэрнатаў, абсталяванне іх усім неабходным, наладжванне пратэзнай вытворчасці, многіх іншых відаў дапамогі, так востра неабходнай нашым пенсіянерам і ветэранам.

Гутарыў Іван БРАЛКА,
кар. «Звязды».

АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА 1992 ГОД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

в) дазволіць міністэрствам і ведамствам Рэспублікі Беларусь ствараць спецыяльныя галіновыя і міжгаліновыя пазабюджэтныя фонды навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх работ і асваення новых відаў навукаёмістай прадукцыі за кошт адлічэнняў у размеры 1,5 працэнта сабекошту таварнай прадукцыі (работ). Указаныя сумы адносяцца на сабекошт. У сувязі з гэтым вызваляемыя па рэспубліканскаму бюджэту асігнаванні на галіновыя навукова-даследчыя і вопытна-канструктарскія работы накіраваць на мерапрыемствы па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

г) утварыць у 1992 годзе мэтавы фонд садзейнічання канверсіі ваеннай вытворчасці, што фарміруецца за кошт адлічэнняў ад сабекошту таварнай прадукцыі (работ), якія выпускаюцца прадпрыемствамі абароннага комплексу;

д) дазволіць Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь і камітэтам па сельскай гаспадарцы і харчаванню выканкомаў абласных (Мінскага гарадскога) Саветаў народных дэпутатаў цэнтралізаваць да 20 працэнтаў прыбытку, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемстваў і арганізацый аграпромысловага комплексу, для ажыццяўлення мерапрыемстваў, прадугледжаных галіновымі і рэспубліканскімі мэтавымі праграмамі;

е) прадугледзець у парадку выключэння, што ў 1992 годзе сродкі ад выкупу, акцыяніравання, рэалізацыі дзяржаўнай уласнасці (акрамя сродкаў ад продажу грамадзянам кватэр), якія паступаюць у фонд прыватызацыі, накіроўваюцца ў размеры не менш 80 працэнтаў на фінансаванне расходаў па вялікаванню кіслых глеб калгасаў, саўгасаў і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, а таксама сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. Пры гэтым на ўказаныя мэты накіроўваецца не больш 300 млн. рублёў;

ж) разгледзець заўвагі і прапановы пастаянных камісій Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь, выказаныя пры абмеркаванні бюджэту на 1992 год, і прыняць па іх адпаведныя рашэнні.

Артыкул 18. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь па выніках першага квартала 1992 года пры неабходнасці ўнесці ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы па ўдакладненню даходнай і расходнай частак рэспубліканскага бюджэту і нарматываў адлічэнняў у мясцовыя бюджэты ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў.

Артыкул 19. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь адзначае, што заложаныя пры фарміраванні даходаў і расходаў бюджэту на 1992 год падыходы ва ўмовах крайняга напружання фінансаў рэспублікі накіраваны на аздараўленне эканомікі і вырашэнне сацыяльных пытанняў. Міністэрствам і ведамствам, мясцовым Саветам народных дэпутатаў і іх выканаўчым органам, усім прадпрыемствам, аб'яднанням, арганізацыям і ўстановам забяспечыць найстражэйшы рэжым эканоміі і беражлівасці, павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, строгае выкананне падатковага заканадаўства.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

15 студзеня 1992 г.
г. Мінск.

ПЕРАЛІК

грамадскіх фондаў, арганізацый і асацыяцый, якія ажыццяўляюць дабрачынную, экалагічную і аздараўленчую дзейнасць, унесены прыбытак якім выключаецца ў 1992 годзе з абкладаемага падаткам прыбытку прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый

1. Аб'яднанне беларусаў свету «Бацькаўшчына»
2. Асацыяцыя воінаў-інтэрнацыяналістаў Рэспублікі Беларусь
3. Асацыяцыя «Рэабілітацыя інвалідаў» і «Гуманізм і міласэрнасць»
4. Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры
5. Беларускае рэспубліканскае праўленне Саюза навуковых і інжынерных таварыстваў
6. Беларускае рэспубліканскае таварыства «Дзеці ў бядзе»
7. Беларускае таварыства аховы прыроды
8. Беларускае таварыства інвалідаў
9. Беларускае таварыства радыёбіёлагаў
10. Беларуская асацыяцыя спецыялістаў па ахове працы
11. Беларуская гомеапатычная асацыяцыя
12. Беларускі дабрачынны фонд «Дзяяніца»
13. Беларускі камітэт «Дзеці Чарнобыля»
14. Беларускі камітэт дзеяння «Рэха Чарнобыля»
15. Беларускі ПЭН-цэнтр
16. Беларускі саюз імя П. М. Машэрава дапамогі ахвярам чарнобыльскай аварыі «Зніч»
17. Беларускі саюз удзельнікаў ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы «Прыпяць»
18. Беларускі экалагічны саюз «Чарнобыль»
19. Дабрачынны цэнтр «Водгук»
20. Дабрачынны фонд Савета ветэранаў
21. Дзіцячы фонд Беларусі
22. Маладзёжны экалагічны рух «Беларусь»
23. Нацыянальны фонд адукацыі і культуры Беларусі
24. Рэспубліканскія і мясцовыя фонды развіцця культуры
25. Саюз «Чарнобыль»
26. Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны
27. Таварыства Чырвонага Крыжа Рэспублікі Беларусь
28. Творчыя саюзы Рэспублікі Беларусь
29. Фонд аказання дапамогі ў ліквідацыі на тэрыторыі рэспублікі вынікаў аварыі на ЧАЭС
30. Фонд культуры Беларусі
31. Фонд міжнароднага супрацоўніцтва па сацыяльнай абароне «Беларусь»
32. Фонд міласэрнасці і здароўя Беларусі
33. Фонд міру Беларусі
34. Экалагічны саюз Беларусі
35. Японска-беларускае таварыства «Чарнобыль—Хірасіма»

Падпольны псеўданім —„Кашлаты“

ГЭТАГА ЧАЛАВЕКА я ведаў звыш дваццаці гадоў. Невысокага росту, энергічны, з вясёлым няўрымслівым характарам. Здаецца, ніколі ён не журыўся, не губляўся ні ў якой сітуацыі — складаная яна ці супярэчлівая — мой старэйшы таварыш і калега Амяльян Сцяпанавіч Шурпач.

Я ніколькі не перабольшу: яго лёс па-сапраўднаму незвычайны, неардынарны. Калі я хацеў яшчэ раз пераканацца ў гэтым, прасіў Амяльяна Сцяпанавіча прыгадаць грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны, яго баявых сяброў — Міхаіла Парфёнавіча Барашкава, Георгія Міхайлавіча Шчарбатава, Аляксандра Дзям'янавіча Сакевіча, Піліпа Цімафеевіча Касцюкаўца... І чуў сакавіты, захапляючы, задушэўны расказ.

Аднойчы, у маі 1975 года, я ўбачыў на яго вачах слёзы. Гэта было ў палескай вёсцы Дварэц Любанскага раёна, куды мы прыехалі разам з Амяльянам Сцяпанавічам на ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі, прысвечанай тым слаўным незабыўным падзеям і справам, якім, разам з іншымі, і ён аддаў сваю маладосць. Быў шматлюдны мітынг, цёплыя, пранікнёныя выступленні. А калі са сцяны новай хаты, пабудаванай мясцовым саўгасам «Гарадзяцічы» для былой памочніцы падпольшчыкаў і партызан Мінскага партызанскага злучэння Марфы Канстанцінаўны Мігун, знялі пакрывала і прысутныя ўбачылі мемарыяльны знак з надпісам: «Тут у студзені 1943 года адбылі выхад у падполлі газеты «Звязда»—орган ЦК і Мінскага абкома КП(б)Б і «Чырвоная змена» — орган ЦК і Мінскага абкома ЛКСМБ», па твары Шурпача папаўзла непадробная сляза. Успаміны аб суровых днях і баявых паходах кранулі сэрца стойкага, мужнага чалавека.

...Глыбокая восень 1942 года. На поўдні рэспублікі — у Слуцкім, Любанскім, Акцябрскім, Капаткевіцкім, Старобінскім, Глускім, Петрыкаўскім і іншых раёнах масавы характар набываў партызанскі рух.

У адзін з апошніх дзён кастрычніка ў штаб Мінскага злучэння выклікалі маладога партызана Амяльяна Шурпача. Разам з ім, даваенным адказным сакратаром капаткевіцкай раённай газеты «Бальшавік», туды запрасілі і яго былых падначаленых — наборшчыкаў друкарні Мікалая Курыку і Ніну Цылько.

— А, стары знаёмы,— замест прывітання сказаў Раман Навумавіч Мачульскі, намеснік камандуючага Мінскага злучэння.— Я рады сустрэчы: даўно не бачыліся. Бадай, з тых часоў, калі вадзіў нас лясными сцежкамі ў Любанскі раён...

— Ну, і памяць жа ў чалавека,— адказаў сам для сябе Амяльян.— Калі тое было, а, бач ты яго, памятае...

Запрасіў іх Мачульскі сесці, павёў павольную гамонку.

— Думаю, вы ў курсе спраў: фашысты пачалі займацца масавым адурманьваннем нашага народа, — казаў Раман Навумавіч.— Бачылі, мабыць, і ўсялякія там «газэты», «песткі», «народныя шляхі». І хоць людзі ў большасці разумеюць усю хлусню, нам таксама трэба брацца за сістэматычную арганізацыю прапагандысцкай работы. А першае слова тут павінен сказаць падпольны друк. Правільна я кажу, Амяльян?

Веставы адвёў іх у хату жыхара вёскі Сасноўка Любанскага раёна Рыгора Цагельніка. У кутку ляжала куча шрыфтоў, некалькі паламаных кас. Да паўночы партызаны разабралі шрыфты па кеглях, падрамантавалі касы. Але не хапала прабельнага матэрыялу, варштатак, вугалкоў...

— А дзе ўсё гэта ўзяць? — паставіў пытанне Р. Н. Мачульскі, які ўвесь гэты час дапамагаў паліграфістам.

— Есць. І варштаткі, і вугалкі, і шрыфты,— Шурпач хітравата прыжмурыў вока, штосьці прыгадваючы ў памяці.— Толькі вось як усё гэта ўзяць?

І далажыў намеснику камандуючага злучэннем, што перад прыходам фашыстаў у Капаткевічы частку рэдакцыйнага рыштунку схаваў у зямлі — пад вуглом хлява непадалёку ад друкарні. Аднак цяпер там захопнікі, буйны гарнізон.

План быў распрацаваны неадкладна. У суправаджэнне Амяльяну Шурпачу і Мікалаю Курыку выдзелілі партызан атрада імя Гастэлы. Спыніліся яны ў вёсцы Чалюшчавічы — за шэсць кіламетраў ад Капаткевіч. Цёмнай ночы Амяльян і Мікалай прабраліся ў гарнізон, звярнуліся за дапамогай да брата Мікалая Аляксандра Курыкі. Пад покрывам цемры ўтрох ссыпалі ў мяшкі друкарскія матэрыялы. А на наступны дзень Аляксандр паклаў іх на фурманку, закідаў гноем і вывез у Чалюшчавічы.

ПЕРШАЯ ДРУКАВАНАЯ прадукцыя стала звычайная лістоўка. У ёй партызаны паведамілі аб зверствах акупантаў у Асіповіцкім раёне, дзе яны знішчылі разам з жыхарамі паселішчы Бортнікі, Межнае, Прашчаха і іншыя.

— І, бадай, толькі тады мы зразумелі, якой адказнай і складанай справай будзем займацца ў далейшым,— прыгадваў пазней Амяльян Сцяпанавіч Шурпач.

Напярэдадні новага, 1943 года па рацыі быў прыняты тэкст прысягі партызана. Шурпач разам са сваімі таварышамі хуценька набралі яе, надрукавалі, а сувязныя даставілі лістоўкі ва ўсе атрады і брыгады злучэння. 31 снежня разам з байцамі атрада імя Гастэлы партызанскую прысягу прынялі і супрацоўнікі падпольнай друкарні.

25 студзеня іх па чарзе выклікалі ў штаб злучэння. Два незнаёмыя чалавекі падрабязна распытвалі паліграфістаў, калі прыйшлі ў партызаны, чым займаліся да пачатку вайны... Адным з іх быў першы сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі Міхаіл Васільевіч Зімянін, другога не ведаў ніхто.

На наступны дзень Амяльяна знайшоў Піліп Цімафеевіч Касцюкавец — былы рэдактар любанскай раённай газеты, палітрук аднаго з партызанскіх атрадаў. Тэрмінова сабраліся ў дарогу: куды і чаго ён не растлумачыў. Выехалі ў напрамку вёскі Шостая брыгада, якую потым перайменавалі ў Дварэц. Спыніліся ў крайніх хатах, у якіх жылі салдаткі Марфа Канстанцінаўна Мігун і Марыля Ануфрыеўна Бубіч.

Сем чалавек сабраліся ў хаце Марфы Мігун. Амаль усе ведалі адзін аднаго. Георгій Міхайлавіч Шчарбатаў працаваў карэспандэнтам «Савецкай Беларусі», восенню 1942 года разам з масквічамі-аўтаматчыкамі пехатой дабраўся ў варожы тыл. Аляксандр Дзям'янавіч Сакевіч — радыст, ён прымаў зводкі Саўінфармбюро. Піліп Цімафеевіч Касцюкавец — рэдактар мясцовай «раёнкі». Амяльян Сцяпанавіч Шурпач, Мікалай Рыгоравіч Курыка і Ніна Аркадзьеўна Цылько — былыя супрацоўнікі капаткевіцкай газеты. Словам, калегі, аднадумцы. І толькі таго, што прыехаў з Зімяніным, высокага ростам, з густой прыгожай прычоскай, ніхто з прысутных не ведаў.

— Маё прозвішча Барашкаў,— прадставіўся ён.— Завуць мяне Міхаіл. Будзем выдаваць газеты «Звязда» і «Чырвоная змена». Умовы — самая жорсткая канспірацыя. Любое парушэнне будзе карацца па законах ваеннага часу.

27 студзеня 1943 года ў зоне Мінскага партызанскага злучэння выйшаў першы нумар «Звязды».

...«Звязда» выходзіла два разы ў тыдзень, «Чырвоная змена» — адзін. «Маглі, вядома ж, і часцей мы іх выдаваць,— шмат разоў казаў потым Амяльян Сцяпанавіч, — але не хапала паперы, матэрыялаў з месц. Аднак у атрадах, акупіраваных вёсках Беларусі нашы выданні чакалі з вялікім нецярпеннем і інтарэсам».

Газеты сапраўды хутка заваёўвалі чытача. За дзень да выхаду «Звязды» ў штабе злучэння ўжо збіраліся сувязныя з розных брыгад, атрадаў, ад падпольных арганізацый гарадоў і вёсак рэспублікі.

У канцы сакавіка 1943 года нямецка-фашысцкія захопнікі нечакана з'явіліся непадалёку ад Шостай брыгады: партызаны спынілі іх за чатыры кіламетры, на рацэ Арэса. Стрэлы чуліся літаральна побач.

— Неадкладна збіраемся ў дарогу! — аддаў загад М. Барашкаў.

— Але ж паласа не гатова, — адгукнулася Ніна Цылько.

— Закончым у іншым месцы.

Хвілін за пяць — дзесяць сабраліся падпольныя газетчыкі, і ў дарогу. Спыніліся прама сярод Загальскіх балот, дарабілі нумар і графік выхаду «Звязды» не сарвалі. Потым рэдакцыя спынілася ў невялікай палескай вёсачцы Рэпін таго ж Любанскага раёна. Для канспірацыі ў чэрвені 1943 года зноў памянялі месца знаходжання «Звязды» і «Чырвонай змены»: размясціліся прама на ўлоні прыроды — на ўскраіне Чорнага балота.

Аднаго разу наведаў гэты таямнічы востраў Друку, як называлі яго паміж сабой супрацоўнікі рэдакцыі, Міхаіл Васільевіч Зімянін. Першым яму трапіў на вочы Амяльян Шурпач. Павіталіся, узрадаваліся сустрэчы. Але не спадабаўся Зімяніну знешні выгляд газетчыка.

— Чаму ты такі неакуратны, кашлаты?! Неадкладна ідзі ў атрад і прывядзі сябе ў парадак...

Не змог Амяльян Сцяпанавіч растлумачыць, што не да знешняга выгляду яму — работа. Ды і дзіркі на вопратцы не ад неакуратнасці, а ад гарачага металу, самаробных шчолачаў, што выкарыстоўвалі пры выпуску газет.

Загад Зімяніна ён выканаў: і пагаліўся, і вопратку памяняў. Толькі вось мянушка, дадзеная Міхаілам Васільевічам, засталася на ўсё жыццё. Шматразоў чуў я, як пры сустрэчы ласкава называлі Амяльяна Сцяпанавіча «Кашлатым» таварышы па партызанскай барацьбе. Ды і сам ён ніколі не саромеўся гэтага «імя»: узяў яго сабе літаратурным псеўданімам. У пяцідзесятыя — васьмідзесятыя гады подпіс «Кашлаты» стаяў пад многімі публікацыямі, змешчанымі на старонках родных Шурпачу «Звязды», «Чырвонай змены», а таксама часопісаў «Вожык», «Беларусь».

...Пасля разгрому гітлераўцаў пад Арлом і Белгарадам Чырвоная Армія імкліва перайшла ў наступленне. Набліжалася вызваленне роднай Беларусі.

— З яшчэ большым уздымам працавалі мы ў тыя дні,— прыгадваў Амяльян Сцяпанавіч.— Усе разумелі: праўдзівае слова так патрэбна было і партызанам, і мірнаму насельніцтву, што знаходзілася на акупіраванай тэрыторыі. Але так мала заставалася ў нас паперы, фарбы. Няўжо давядзецца спыніць выданне газет? З такой думкай не пагаджаліся ні мы, ні нашы камандзіры. Васіль Іванавіч Казлоў, наведаўшы аднойчы нас, запэўніў, што папера будзе.

Нядоўга чакалі партызанскія паліграфісты выхавання абяцанага. Неяк сустракае Шурпач на тэрыторыі астраўка камандзіра 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады Віктара Ільіча Лівенцава: яго байцы былі адзнакі з самых актыўных чытачоў «Звязды» і «Чырвонкі». У руках камбрыг трымаў вялікі скрутак.

— Чуў: ёсць патрэба ў паперы,— весела сказаў ён.— Трымайце падарунак ад бабруйчан.

Разгарнулі скрутак, а там каля дзвюх тысяч лістоў паперы!

— Дзе ўзялі, таварыш камбрыг? — не ўтрымаўся Амяльян Сцяпанавіч ад пытання.

— Давялося варожую штабную машыну падкаравуліць,— прызнаўся Лівенцаў.— А што ж рабіць: папера для «Звязды» і «Чырвонай змены» патрэбна ж...

ВОРАГ ЧАПЛЯЎСЯ за кожную пядзю савецкай зямлі, ён імкнуўся выкарыстаць самы нязначны шанц, каб прадоўжыць сваё існаванне. У студзені 1944 года гітлераўцы паспрабавалі налажыць блакаду Мінскага партызанскага злучэння. Партызаны і падпольшчыкі з баямі прабіваліся на захад.

На выходзе чацвёртага дня маршу паступіла каманда спыніцца ў вёсцы Камсамолец цяперашняга Салігорскага раёна. Тут і размясціліся штаб злучэння, атрад імя Гастэлы, рэдакцыя падпольнай «Звязды». «Чырвоная змена» з 1 студзеня 1944 года, з пераездам ЦК ЛКСМ Беларусі ў Навабеліцу пад Гомелем, пачала легальнае жыццё.

— Мацней, чым варожыя кулі, касіў партызан тыф,— прыгадваў пазней Амяльян Шурпач.— Хворых не было каму глядзець, лячыць іх. У каго хапала сіл — выпаўзаў з хат на паветра. Пра такіх казалі: вытрымалі блакаду.

Зваліла хвароба і Міхаіла Барашкава. Тры дні мужна трымаўся ён. А потым страціў прытомнасць. Таварышы па рэдакцыі па чарзе дзяжурылі каля яго. Усё, што мог, рабіў і доктар С. М. Швец. Аднак аслаблены арганізм рэдактара падпольных «Звязды» і «Чырвонай змены» не вытрымаў: 22 лютага Міхаіл Парфёнавіч памёр.

Вясной 1944 года рэдакцыя вярнулася на Любаншчыну, на родны востраў Зыслаў. Паперы не было, «Звязду» не выпускалі. Шурпач і яго таварышы дапамагалі супрацоўнікам слуцкай падпольнай газеты «Народны мсцівец», якія мелі невялічкі запас шэрай абгортачнай паперы.

У трэцяй дэкадзе чэрвеня партызанскія радысты прымалі паведамленні Саўінфармбюро аб наступленні нашых войск у раёнах Віцебска, Магілёва. Аднойчы Георгія Міхайлавіча Шчарбатава, выконваючага абавязкі рэдактара «Звязды», выклікалі ў штаб. Вярнуўся ён з пакетам паперы.

— Будзем, сябры, выпускаць апошні нумар у падполлі. Такі загад.

16 ліпеня 1944 года супрацоўнікі падпольнай «Звязды» прымалі ўдзел у партызанскім парадзе ў Мінску. З пачуццямі выканання абавязку прайшлі і яны па вуліцах разбуранай беларускай сталіцы.

У МАІ 1985 ГОДА «Звязда» запрасіла сваіх былых супрацоўнікаў — ветэранаў вайны і працы на ўрачыстасць, прысвечаную 40-годдзю Вялікай Перамогі. У разгар святкавання пазваніў К. Т. Мазураў, які знаходзіўся ў Мінску. Даведаўшыся, што ў рэдакцыі праходзіць сход, цёпла і шчыра павіншаваў усіх нас з юбілеем. «А Шурпач сярод вас?» — спытаў Кірыл Трафімавіч. І, атрымаўшы сцвярджальны адказ, дадаў: «Сардэчнае прывітанне яму, Кашлатаму. Слаўны ён быў партызан...»

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай Амяльян Сцяпанавіч працаваў карэспандэнтам «Чырвонай змены» па былой Бабруйскай вобласці, потым — у «Звяздзе», выдавецтве «Беларусь». Будучы персанальным пенсіянерам рэспубліканскага значэння, з родным «Звяздой» не парываў сувязей ні на адзін дзень...

Анатоль МЯСНІКОЎ.

АД АЎТАРА: Гэты нарыс напісаны яшчэ ў 1988 годзе — спецыяльна для зборніка, прысвечанага беларускім журналістам — удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Напісаны паводле архіўных дакументаў, на падставе сустрэч і гутарак з многімі дзеючымі асобамі — Р. Н. Мачульскім, В. І. Лівенцавым і, вядома ж,— А. С. Шурпачом.

Нарыс, аднак, быў «зарэзаны». Аднаму са складальнікаў зборніка (які, дарэчы, так яшчэ і не выйшаў у свет) — Ісаку Пучынскаму — падалося (цытую па ягонаму заключэнню), што «роля друкара Шурпача ў выданні «Звязды» і «Чырвонай змены» перабольшана...». Маўляў, няўжо ён быў сваім і для Мачульскага, і для Лівенцава, і няўжо «сам» Мазураў памятаў пра Шурпача ажно праз сорак гадоў... «Па ўсяму відаць, — рабіў «вывад» Ісак Пучынскі, — што мэта ў аўтара адна: узвысіць Шурпача праз адносіны да яго вядомых у рэспубліцы і краіне людзей...» Калі я паказаў «заключэнне» Амяльяну Сцяпанавічу, ён толькі махнуў рукой...

Тады ж, у 1988-м, нарыс — абсалютна без рэдакцыйных купюр — апублікавала «Мінская праўда». Яго перадрукавала любанская райгазета.

На жаль, у «Звяздзе» сам А. С. Шурпач нарыс друкаваць не дазволіў. «Не трэба, я ж таксама звяздовец», — так абгрунтаваў ён сваё рашэнне.

Колькі дзён назад яго не стала сярод нас. А памяць аб старым звяздоўцу ў нашых сэрцах застанецца назаўсёды. Светлая і ўдзячная, як і само яго жыццё...

РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

«ІНШАДУМЦАЎ ШМАТ ЗА КУХОННЫМ СТАЛОМ І МАЛА НА ПРАКТЫЦЫ»

Вялікі дзякуй газеце за цікавы артыкул аб кнізе А. Уліцёнка «Іншадумцы». Я звярнуў увагу на гэтую кнігу яшчэ на снежаньскім мітынгу, што праходзіў на плошчы Незалежнасці. Але купіць яе не паспеў, аб чым потым вельмі шкадаваў. З таго часу яна мне не трапілася на вочы ні ў кнігарнях, ні ў кіёску ТБМ. Можа, вы мне дапаможаце набыць—падкажыце, куды звярнуцца?

Віталь КАРАЛЁЎ.

г. Мінск.

●

Кнігу «Іншадумцы» не чытаў пакуль, пастараюся адшукаць у кнігарнях. Я ведаю нямала людзей, не такіх вядомых, як Станіслаў Шушкевіч, Зянон Пазьняк, але якія ўсё ж жылі не так, як большасць. Яны, напэўна, ёсць у кожным калектыве, тыя, хто не маўчыць перад начальствам, гаворыць так, як думае, а не прадаецца за дзесятку ці за іншыя льготы. Можа, іх і нельга назваць іншадумцамі, можа, не такія ўжо буйныя праблемы яны вырашаюць, але ж ці напіша хто калі пра іх? Яны столькі цярпелі, іх называлі «крыкунамі», а то і «з прывітаннем». Але яны не лгалі сабе і людзям. Газеты зараз шмат пішуць пра прадпрымальнікаў, фермераў, і гэта патрэбна, але ж трэба пісаць і пра тых, хто быў за людзей, хто будаваў нашу духоўнасць. Можа, не было б ні Пазьняка, ні Хадыкі, калі б яны не адчувалі за сабой многіх і многіх непрыкметных, але смелых і сумленных людзей.

М. ТКАЧЭНКА.

г. Віцебск.

●

Цікава, а ці выйшла б гэтая кніга, калі б не перамагла дэмакратыя ў жніўні? Можа, яе б парэзалі на дробныя кавалачкі выдаўцы і рэдактары, каб заставіцца на сваіх месцах?

Віктар ЛОСЕЎ.

г. Гродна.

●

Маё іншадумства адносіцца да 1979—82 гадоў. Пісаў сустрэчныя заклікі — памятаеце, да кожнага свята з'яўляліся абавязковыя Заклікі ЦК КПСС, што дубліраваліся ва ўсіх газетах, пачынаючы з «Праўды». Былі і другія матэрыялы, дзе я высмейваў і крытыкаваў палітыку кампартыі. За многае давялося расплачвацца. Таму вельмі хацеў бы сустрэцца з Аляксандрам Уліцёнкам. Магу расказаць яму пра тых іншадумцаў, пра якіх ніхто не ведае.

Іван МІРОНЧЫК.

г. Мінск.

●

Хацелася б ведаць, які лёс напаткаў тых, аб кім

РОЗГАЛАС

ДОЎГІ ШЛЯХ ДА ЗОЛАТА

Золата Латвіі (1 тона), якое захоўваецца ў Банку Францыі, будзе пакрыццём уводзімай нацыянальнай валюты, але назад у Латвію прывезена не будзе.

У Латвіі яно, дарэчы, наогул ніколі не знаходзілася. Латвійскае золата было закуплена ў 1933 годзе па тэлеграфнаму распараджэнню Банка Латвіі за грошы, якія захоўваліся ў французскім банку. Да другой сусветнай вайны яно знаходзілася ў падземных сховішчах Банка Францыі — 25 метраў пад зямлёй. У ваенны час, нягледзячы на пануючы хаос, золата было эвакуіравана ў Марцініку ці Сенегал. Цяпер яно зноў знаходзіцца ў сейфах Банка Францыі.

Банк Францыі стаў першым замежным банкам, які афіцыяльна вярнуў Латвіі золата, якое ёй належыць.

«Каб атрымаць у сваё распараджэнне золата, змешчанае ў Амерыцы, Швейцарыі і Англіі, неабходна толькі выканаць фармальнасці. На жаль, золата, якое знаходзіцца ў Англіі, было выкарыстана ў 1967 годзе для пакрыцця доўгу СССР брытанскім грамадзянам з часоў вайны», — паведаміў Э. Рэпшэ, прэзідэнт Банка Латвіі.

БелаПАН.

P. S. Брытанія заявіла, што кампенсуе краінам Балтыі іх залатыя ўклады, якія захоўваюцца ў Банку Англіі з 1940 года, у аб'ёме прыкладна 90 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў (160 мільёнаў долараў).

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

◎ Іранскі лідэр ахарактарызаваў паведамленні Захаду аб велізарных накапленнях Іранам зброі як спробу ўвесці ў зман міжнародную грамадскасць і запалохаць суседнія з Іранам краіны, а таксама апраўдаць сваю ваенную прысутнасць у рэгіёне. Іран не імкнецца выконваць паліцэйскія функцыі ў рэгіёне, але не дапусціць, каб іх выконвалі ЗША.

◎ Саудаўская Аравія абвергла звесткі заходніх сродкаў масавай інфармацыі аб рэпрэсіях у краіне супраць дысідэнтаў, якія абвінавачваюць урад у адыходзе ад догмаў іслама.

◎ Урад Венесуэлы пасля няўдалай спробы дзяржаўнага перавароту вырашыў павысіць мінімальную заработную плату.

◎ ЗША пачалі разгорнутую кампанію па дастаўцы міжнароднай гуманітарнай дапамогі былым савецкім рэспублікам. У гэтай аперацыі прымаюць удзел больш як сорак краін. Дзяржсакратар ЗША Бейкер прыбыў у Германію, каб удзельнічаць у адкрыцці гэтай аперацыі. Некалькі самалётаў вылецелі ўжо з ваенных базы пад Франкфуртам-на-Майне. Дапамога будзе дастаўляцца ў 20 гарадоў СНД. Спецыяльныя брыгады з мэтай прадухілення раскрадання грузаў ажыццяўляюць нагляд за дастаўкай прадуктаў і медыкаментаў у дзіцячыя дамы і бальніцы.

РАДЫЁ «СВАБОДА»

◎ Каля дзесяці тысяч міліцыянераў ахоўвалі ў Маскве грамадскі парадак у мінулую нядзелю ў час мітынгаў прыхільнікаў і праціўнікаў рэформ Б. Ельцына. Дэманстрацыі супраць радыкальнай эканамічнай і палітычнай рэформ у выхадныя адбыліся ў Новасібірску, Іркуцку, Ангарску, Краснаярску, Чэлябінску, Петразаводску і іншых гарадах Расіі.

Лідэр сербскіх сепаратыстаў Бабіч рэзка выступіў супраць размяшчэння 10-тысячнага кантынгенту войск у Югаславіі. Паводле яго слоў, у выніку гэтай акцыі сербы, якія жывуць у харвацкіх раёнах, могуць падвергнуцца рэпрэсіям з боку мясцовага насельніцтва.

◎ Алжырскае кіраўніцтва аб'явіла аб увядзенні ў краіне надзвычайнага становішча. Паліцыі прадастаўлены дадатковыя паўнамоцтвы праводзіць арышты і вобыскі падазроных асоб. Ужо адбыліся ўзброеныя сутычкі паміж сіламі бяспекі і праціўнікамі ўрада Алжыра. У выніку амаль 40 чалавек забіты, сотні арыштаваны і кінуты ў турмы.

АБ КАРЫСЦІ ЭКАНОМІІ НА КІШЭННЫХ РАСХОДАХ

Можна сцвярджаць, што першая ж аперацыя, праведзеная амаль усімі навучэнцамі Міжнароднай школы бізнесу ў Лейпцыгу (у верасні сюды была адпраўлена Гандлёва-прамысловай палатай рэспублікі група з 10 чалавек), была паспяховай. У духу часу і духу таго ж бізнесу. Калі ў Лейпцыг будучыя слухачы ляцелі самалётам, то назад ехалі (нагадаем: амаль усе) на ўласных аўтамабілях. Адкуль гэтая блакітная мара многіх нашых суграмадзян? Набылі за маркі, якія выдаваліся ў школе (не здзіўляйцеся), так сказаць, на кішэнныя расходы...

Аўтамабілі — гэта, вядома, вельмі выдатны набытак для нашага, на жаль, такога зваладалага на розныя такія рэчы грамадзяніна. Але яшчэ больш каштоўны набытак прыдбалі былыя ўжо цяпер «студэнты», калі мець на ўвазе, што яны ажно тры месяцы круціліся ў свеце дынамічнага, насычанага рызыкай і цвёрдым разлікам, кампетэнтнасцю і высокім прафесіяналізмам сапраўднага бізнесу, што яны паварыліся ў катле арыентуючых строга на справу і поспех ведаў, устанавілі цікавыя, вельмі неабходныя ў наш рыначны час сувязі і, магчыма, — з будучымі партнёрамі. А ездзілі для навучання ў Лейпцыгскую школу бізнесу кіраўнікі і спецыялісты прадпрыемстваў Мінска і Мінскай вобласці, і гэта была першая група. Дарэчы, нагадаем: адбор кандыдатаў праводзіўся з удзелам нямецкага боку, прычым яны разглядаліся як магчымыя будучыя партнёры. Да кандыдатаў прад'яўляліся наступныя патрабаванні: вопыт работы на вытворчай пасадзе, узрост да 40 гадоў і абавязковае веданне нямецкай мовы.

Аднак калі была першая група, значыць, павінна быць і другая?

Так, і яна адправілася ў Лейпцыг некалькі дзён таму назад.

А дырэктар фірмы «Мінскзнешнесервіс» Гандлёва-прамысловай палаты рэспублікі П. Юшкевіч зазначае, што будуць і трэцяя, і чацвёртая... Увогуле, сёлета плануецца накіраваць пяць груп, вядома, у розны тэрмін.

Паспрабуем паўтарыць поспех першапраходцаў? Тым больш, што і навучанне — бясплатнае, дакладней — плаціць нямецкі бок (у яго, як адзначана ўжо, свой інтарэс, і больш з разлікам на перспектыву)... А для тых, хто за доўгія школьныя ды студэнцкія гады так і не засвоіў нямецкай мовы, фірма прапануе (возьміце на заўвагу на ўсякі выпадак, як пазваніць: 66-06-73) паскораны, на працягу некалькіх месяцаў, курс інтэнсіўнага навучання нямецкай мове. І не толькі прапануе, але і гарантуе.

І. АЛЯКСАНДРАЎ.

БЕЛАРУСКАЯ СМЯТАНА З ГАНКОНГАЎСКІМ ПРЫСМАКАМ

СТАЎБЦОЎСКІ РАЁН (Э. Саевіч). Няма сумнення, што спробы старшыні калгаса «Праўда» А. Рабчынскага зацікавіць замежных партнёраў ва ўстаноўцы ліній па перапрацоўцы некаторых відаў сельгаспрадукцыі будуць выніковыя. Нядаўна ў «Праўдзе» пабываў прадстаўнік фірмы «Метатэк» Алекс Чу з Ганконга.

У выніку гэтага візіту замежны госць зрабіў для сябе такі вывад: ёсць добрыя магчымасці для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва інафірм з беларускім калгасам. У «Праўдзе» чакаюць цяпер канкрэтных прапаноў і, натуральна, замежнага капіталу.

ВЫЙГРАЛІ Ў АБКРАДЗЕНЫХ

РЭЧЫЦА (У. Пернікаў). Тут знаходзілася футбольная каманда з польскага горада Беластока, якая праводзіць серыю матчаў з мясцовымі спартсменамі. Першая гульня закончылася ўнічыю. Другую выйгралі рэчыцы — 3:1. Перамога дасталася ім параўнальна лёгка. Балельшчыкі жартуюць: «Палякі былі не ў настроі, бо напярэдадні іх абакралі». Нехта залез у пакой гасцініцы, дзе жыў іх трэнер Вітольд Маразоўскі, і забраў усе 28 футбольных мячоў. Слядоў узлому пры гэтым выяўлена не было.

ГРАНАТА БЫЛА БАЯВОЙ

Страшна падумаць, як мог выкарыстаць паляўнічае ружжо, баявая граната Ф-1 і патроны раней судзімы, нідзе не працуючы Б., затрыманы работнікамі міліцыі ў сваёй кватэры ў стане наркатычнага ап'янення. Былі канфіскаваны і адпаведнае рэчыва, і прыстасаванні для прыгатавання «зелля».

Следчы ізалятар — у музей антысталінізму

МІНСК. Завяршыўся ўстаноўчы з'езд Беларускай асацыяцыі ахвяр палітычных рэпрэсій. Выбраны першы прэзідэнт асацыяцыі — загадчык аддзела археалогіі Інстытута гісторыі Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь Георгій Штыхаў, віцэ-прэзідэнтам — Уладзімір Адамушка. На з'ездзе была таксама сфарміравана рада з трыццаці чалавек і ўпраўленне—з 9. Адзінае, што засмуціла нававыбранага прэзідэнта, — безальтэрнатыўнасць выбараў. Але адначасова гэта акалічнасць і абнадзейвае, што выбраны сапраўды аўтарытэтны, паважаны чалавек, які зможа на роўных размаўляць з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі рэспублікі.

Адно з самых актуальных пытанняў, якое ставіць перад асацыяцыяй, — аказанне матэрыяльнай дапамогі палітычна рэпрэсіраваным. Пакуль жа нават тыя 160 рублёў, якія павінны выдавацца ўсім ахвярам незаконных рэпрэсій, застаюцца толькі «на паперы».

На з'ездзе ўнеслі прапанову пераўтварыць следчы ізалятар № 1 г. Мінска, дзе да нядаўняга часу людзі пакутавалі за перакананні, у музей антысталінізму.

Аляксандр КОКТЫШ.

Навошта людзі ідуць да чарадзея?

Мой калега па рэдакцыі меў неасцярожнасць падрыхтаваць вялікае інтэрв'ю з дастаткова вядомым па выступленнях на эстрадзе чалавекам з ліку тых, хто называе сябе «чарадзеем». Не збіраюся ўступаць у дыскусію аб правамернасці прысваення такога тытула, аднак, нават будучы прыхільнікам экстрасенсорыкі і акультызму, думаю, што выкарыстанне сернага зараду ў стэарынавай свечцы — гэта з арсенала артыста таннага балаганчыка, а не чарадзея ці мага.

Размова не пра гэта. Пасля публікацыі інтэрв'ю наша рэдакцыя надоўга была выключана з нармальнага рабочага працэсу: амаль няспынныя тэлефонныя званкі, частыя візіцёры, сотні пісьмаў у дзень на імя майго калегі (і гэта пры тым, што да самога «чарадзея» пісьмы ідуць мяхамі). Натуральна, адзін чалавек справіцца з гэтым патокам не ў сілах, і мы, як можам, дапамагаем яму. (Дарэчы, карыстаючыся выпадкам, хачу сказаць усім, хто напісаў у рэдакцыю, што ўсе пісьмы пасля сартавання трапляюць-такі да «чарадзея». Далей мы за іх не адказваем...). І гэта работа з людзьмі, з пісьмамі навяла мяне на роздум.

Па-першае, немагчыма без душэўнага болю глядзець на гэтыя груды пісьмаў, у большасці з якіх — цяжкая асабістая драма. У сына саркома... Пухліна мазгоў... Дзіцячы цэрэбральны параліч... Эпілепсія... Цукровы дыябет... Цяжкі бронхіт з астматычным кампанентам... Параліч пасля інсульту... Няма канца заклікам аб дапамозе. Да чаго ж давяла нас «агульнадаступная бясплатная» медыцына, як жа сябе скампраметавалі ўрачы, якія ішлі калісьці ў медыцынскія навучальныя ўстановы не па прызванню, а па мінімальнасці конкурсу... І, што яшчэ страшней, нельга не зразумець гэтых людзей, якія звяртаюцца да «цёмных сіл» — многія ж з пералічаных хвароб адносяць да карміччных, і «звычайны» экстрасенс за іх лячэнне не возьмецца.

Навошта яшчэ ідуць людзі да чарадзея? Ледзь ці не кожнае чацвёртае пісьмо — аб п'янстве. П'юць бацькі, маці, дзеці, браты, усе разам. Гэта таксама страшныя пісьмы. Як правіла, яны напісаны на многіх лістах, утрымліваюць вялікія расказы-споведзі, але... практычна няма ў іх надзеі на тое, што «чарадзей» ці наогул хтосьці дапаможа. Эх, каб сапраўды можна было па тэлевізары «закадзіраваць» усіх нашых алкаголікаў...

Савецкі чалавек не верыць не толькі медыцыне ва ўсіх яе праяўленнях. Ён не верыць, скажам, і міліцыі, і «Алексу»: у адным з пісьмаў ёсць просьба да «чарадзея» знайсці выкрадзены тэлевізар.

Што, магчыма, больш натуральна, шмат пытанняў на тэму, як «прываражыць». Здавалася б, народны спосаб з прутком з веніка абышоў ужо ўсе газеты і экраны, але тэма гэта, відаць, вечная, як любоў. І я не спыняўся б на такіх інтымных праблемах, каб не просьбы, якія сустракаюцца час ад часу, пакідаючы непрыемны асадак. Дзяўчына ў ранкім узросце пайшла замуж за хлопца, якога зусім не кахала, пайшла проста так, паспрабаваць, што атрымаецца. Аказалася — нецікава, праз тры месяцы па ўласнай ініцыятыве пакінула яго. Праз некаторы час выйшла за другога, якога проста ненавідзела (матывы свайго ўчынку не тлумачыць; наколькі можна зразумець, хацелася насаліць сяброўцы). На гэты раз пратрымалася паўгода. Праўда, потым нарадзіла дзіця. Цяпер яна зразумела, што дзіцяці патрэбен бацька. У сувязі з чым і звяртаецца да «чарадзея», няхай ён ёй прыварожыць каго-небудзь з іх (усё роўна якога, яна пацерпіць). Ці ж гэта не маральная дэградацыя грамадства? Спачатку я нараблю спраў, а потым — чарадзей, дапамажы! Не, панове, такіх цудаў не бывае. Неяк Анатоль Кашпіроўскі на маё пытанне ў інтэрв'ю, з якімі цудамі яму даводзілася сустракацца, адказаў, што самы вялікі цуд — гэта сам чалавек. У адным пісьме чалавек, які не п'е, не курыць, і, што называецца, прыстойны мужык, скардзіцца на тое, што маладая жонка на курорце закахалася і кінула сям'ю з дзіцем. Цяпер ён просіць яе прываражыць зноў. Але хутчэй за ўсё, зразумеўшы сваю памылку, праз некаторы час пра цуд будзе прасіць ужо яна. Дык можа, проста не трэба рабіць недарэчных крокаў, можа, галоўны цуд, які нам усім трэба будзе здзейсніць, — гэта пакончыць з безадказнасцю, да якой нас дзесяцігоддзямі прывучалі, думаючы за нас і прымаючы за нас рашэнні. Безадказнасць у асабістым жыцці — толькі водгаласак той, глабальнай... Які ўжо тут чарадзей дапаможа, калі мы не дапаможам сабе самі.

І, нарэшце, выпадак, які, уласна, і прымусіў мяне ўзяцца за гэты матэрыял. У нядзеі з нашай дапамогай сустрэцца з «чарадзеем» у рэдакцыю прыйшоў чарговы наведвальнік. Ён расказаў, што з яго сынам здарылася страшнае няшчасце. Месяц назад, вяртаючыся дамоў, ён без дай-прычыны напаў на жанчыну, якая праходзіла міма, у кустах распрануў, нанёс цяжкія нажавыя раненні (у прыватнасці, пашкоджаны пазаночнік, не расплюшчваецца вока), абрабаваў і пайшоў. Затым перадумаў, вярнуўся, давёў пацярпеўшую да бліжэйшых дамоў... І зноў пайшоў, на гэты раз дамоў, дзе не падаў выгляду бацькам, што наогул штосьці здарылася. І толькі праз два тыдні, калі зразумеў, што ў невялікім гарадку яго апазналі і арышт — справа некалькіх дзён, злачынца «добраахвотна» здаўся міліцыі. Экспертыза пацвердзіла псіхічнае здароўе маладога чалавека. У час расказу я, прадбачачы просьбу аказаць дапамогу скалечанай жанчыне, узмоцнена ўспамінаў, хто са знаёмых экстрасенсаў ці лекараў мог бы ўзяцца за аднаўленне функцый спіннога мозгу. Але просьба была іншай... Знерваваны бацька абавязкова хацеў бачыць чарадзея, экстрасенса, гіпнацізёра, які... вымусіў бы пацярпеўшую змякчыць паказанні на судзе ці адмовіцца ад абвінавачвання — яго ж сынок не вінаваты, ён не павінен адседзець 12 гадоў... Бацька сцвярджаў, што сын ніколі не быў хуліганам, гэта выпадковы, неабдуманы ўчынак.

Так, штосьці мнагавата стала такіх «нехуліганаў», Я ў рэзкай форме адмовіў госцю, сказаўшы, што ні я, ні мае сябры яму ў гэтай справе не дапамогуць. Сам жа падумаў: а дапамогу ж знойдзе. Гавораць жа аб існаванні сект чорнай магіі, аб маладзёжных групоўках, якія спавядаюць сатанізм. Асабліва, калі прыняць на веру публікацыі «Рабочей трибуны» аб полтэргейстах з адкрыта хуліганскімі замашкамі ці кантактарах, якія адлюстроўваюць незямную цывілізацыю, але нездольныя ясна звязаць і двух слоў. Духоўна пусты чалавек, для якога вар'яцкая песня аб «алюмініевых агурках на брызентавым полі» ўяўляецца вяршыняй сусветнай культуры, дарваўшыся да дасягнення навукі, што можа ўяўляцца «цудам», будзе падобны на Антыхрыста. Затое яго вельмі ўпадабае тая дзяўчына, для якой не мае значэння, з якім мужам жыць.

Так, 74 гады нас гіпнацізіравалі, нас зачароўвалі, нам унушалі, што сам па сабе чалавек — нішто, што сіла толькі ў калектыве, а ўся мудрасць — наверсе, таму няварта і галаву забіваць. Вось мы і пажынаем плён гэтага гіпнозу. А пара было б ужо ад яго збавіцца і зразумець, нарэшце, што ўсе цуды — у нашых руках. Прабачце, але «ніхто не дасць нам збаўлення...»

Анатоль АНІСІМАЎ.
ІС «Для всех».

Жалязоўскі пакуль не спяшаецца...

НА АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯХ У АЛЬБЕРВІЛІ — РАБОЧЫЯ БУДНІ. 2. 196 СПАРТСМЕНАЎ З 64 КРАІН СВЕТУ ПАЧАЛІ ВЫЗНАЧАЦЬ КАРАЛЕЎ І КАРАЛЁЎ ЗІМОВЫХ ВІДАЎ СПОРТУ

...Прыгожым, яркім і непаўторным відовішчам стала цырымонія адкрыцця Гульняў XVI Алімпіяды. Пад сваімі святынямі — нацыянальнымі сцягамі — прайшлі на алімпійскаму стадыёну прадстаўнікі пяці кантынентаў свету. Не выглядалі на гэтым фоне «бяздомныя» і нашы атлеты — спартсмены аб'яднанай каманды Садружнасці Незалежных Дзяржаў. На жаль, у самы апошні момант кіраўніцтва нашага спорту было вымушана замяніць раней прызначанага сцяганосца: мінчанін Ігар Жалязоўскі, якому аказалі спачатку гэты давер, як высветлілася, у Альбервіль... не спяшаўся: ён заканчвае ў гэтыя дні падрыхтоўку да стартаў у суседняй з Францыяй Італіі. Яго месца на чале калоны СНД заняў чатырохразовы (таксама, як і Жалязоўскі—чатырохразовы!) чэмпіён свету па біятлону Валерый Мядзведцаў, а белы алімпійскі сцяг з пераплеценымі пяцю кольцамі лунаў над калонай спартсменаў былога СССР зусім натуральна. Хоць, скажам шчыра, і некалькі нязвычна...

Людзі розных рас, нацый і веравызнанняў аб'яднаны ў Альбервілі, як і на ўсіх папярэдніх Алімпіядах, ідэямі брацтва, дружбы, высокіх маральных якасцей. Тут усе роўныя— ад роднаначальнікаў Гульняў — спартсменаў Грэцыі і гаспадароў — французаў — да прадстаўнікоў Андоры, Анцільскіх і Бермудскіх Астравоў, Ямайкі, Ліхтэнштэйна, Манака, Сан-Марына, Свазіленда — дзяржаў, якія і на карце не заўсёды знойдзеш. Як роўныя сярод роўных ішлі ў калонах вялікай алімпійскай сям'і і спартсмены Харваты, Славеніі, Латвіі, Літвы і Эстоніі, якія літаральна перад самым стартам Алімпіяды прызнаны Міжнародным Алімпійскім Камітэтам самастойнымі спартыўнымі дзяржавамі.

Як і прынята ў дзелавых і адказных людзей, гучных прамоў на адкрыцці Гульняў не было. Два суставныя аргкамітэта — славуты ў мінулым французскі гарналыжнік, трохразовы алімпійскі чэмпіён Жан-Клод Кілі і Мішэль Барнье падзякавалі кіраўніцтву МАКа за давер, аказаны іх радзіме— Францыі. У сваю чаргу Прэзідэнт Міжнароднага Алімпійскага Камітэта Хуан Антоніа Самаранч таксама сціпла выказаў упэўненасць, што сіла спорту і міру і на гэты раз будзе вышэй за ўсё. А ганаровае права аб'явіць Гульні XVI Алімпіяды адкрытымі зноў жа па традыцыі было прадстаўлена кіраўніку краіны — арганізатара спаборніцтваў—Прэзідэнту Францыі Франсуа Мітэрану. Выдатны ў мінулым футбаліст, а цяпер галоўны трэнер французскай зборнай па футболу Мішэль Плаціні даставіў на стадыён алімпійскі агонь, які і ўспыхнуў у чашы. Над стадыёнам і над усім светам...

А паядынкі па алімпійскай праграме пачаліся яшчэ да афіцыйнага адкрыцця свята спорту. І, як і на папярэдніх Гульнях, іх распачалі хакеісты. У гэтым, прынамсі, няма нічога дзіўнага — у майстроў клюшкі самы працяглы па часу турнір. Ужо ў суботу згуляны тры матчы. Славутыя канадцы з вялікай цяжкасцю адолелі гаспадароў Алімпіяды — французаў — 3:2, затое зборная Чэха-Славакіі без праблем выйграла ў нарвежцаў — 10:1. А потым на лёд выйшлі хакеісты Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Швейцарыі. Гульня чакалася з вялікай цікавасцю: напярэдадні, літаральна за тры дні да Гульняў, гэтыя каманды сустрэліся ў фінале міжнароднага турніра на «Прызы Нісана» (вядомай японскай аўтамабільнай фірмы) і... здзівілі спартыўны свет вынікам: з лікам 3:0 перамаглі швейцарцы. Чаму здзівілі? Ды таму, што гэта была першая перамога ігракоў альпійскай рэспублікі над грандамі сусветнага хакея — майстрамі нашай краіны.

Дзякуй Богу, двойчы снарад у адну варонку не трапляе. У матчы па праграме Алімпіяды хакеісты СНД не пакінулі сапернікам ніякіх сумненняў у сваёй перавазе. Ігар Болдзін, Віталь Прохараў, Уладзімір Малахаў у першым перыядзе, Сяргей Пятрэнка, Мікалай Баршчэўскі, Юрый Хмылёў — у другім, Андрэй Хамутоў і Вячаслаў Быкаў — у трэцім перыядах закінулі ў вароты швейцарцаў восем шайб, на што тыя толькі незадоўга да фінальнай сірэны змаглі адказаць адным голам (гэта зрабіў Самуэль Бальмер). 8:1 — заяўка на будучы поспех больш чым пераканаўчая.

А ў другі дзень Алімпіяды сталі вядомы імёны першых лаўрэатаў сусветнага спартыўнага форуму. Першы залаты алімпійскі медаль быў уручаны ў нядзелю лыжніцы Любові Ягоравай. Яна выйграла 15-кіламетровую дыстанцыю класічным стылем з вынікам 42 мінуты 20,8 секунды. Больш чым адну мінуту прайграла ёй фінская гоншчыца Мар'я Лукарынен, а трэцюю ступеньку п'едэстала гонару таксама заняла наша спартсменка — Алена Вяльбе.

З дасье «Звязды». Заслужанаму майстру спорту Любові Ягоравай 25 гадоў. Лыжным спортам займаецца з 12 гадоў. Жыве ў Санкт-Пецярбургу. Двухразовая чэмпіёнка свету 1991 года, чэмпіёнка Садружнасці Незалежных Дзяржаў-1992.

Адразу ў дзвюх дысцыплінах святкавалі перамогу ў першы дзень спартсмены Аўстрыі. Эрнэст Ветары выйграў спаборніцтвы ў скачках на лыжах з 90-метровага трамплiна, а Патрык Ортліг быў мацнейшым у скорасным спуску. Дыстанцыю 3.000 метраў сярод жанчын-канькабежак выйграла прадстаўніца Германіі Гундэ Німэн.

Анатоль НЕСЦЕРАЎ.

Вакол Алімпіяды

Амерыканскі фігурыст Крыстофер Боўмэн — у выдатнай спартыўнай форме. «Траймы аксель атрымліваецца ў мяне як ніколі добра», — без залішняй сціпласці заявіў амерыканец.

Не ўсё, аднак, падабаецца яму ў Альбервілі. «Дарога ад Алімпійскай вёскі да матча вельмі доўгая. Аўтобус цягнецца ў караване 45 мінут, і пасля гэтага цяжка пачынаць трэніроўку», — сказаў Боўмэн.

Па прапанове свайго трэнера Джона Нінса Крыстофер адмаўляецца адказваць на пытанні журналістаў наконт нядаўніх абвінавачванняў ва ўжыванні наркотыкаў, якія прагучалі ў яго адрас у час чэмпіяната ЗША.

***

Пасля заканчэння гульняў у Альбервілі кожны нацыянальны камітэт атрымае па 6.000 долараў з фонду алімпійскай салідарнасці МАК. Апрача таго, да гэтай сумы дабавяцца яшчэ па 800 долараў за кожнага ўдзельніка.

Бюджэт фонду салідарнасці на 1992 год — 1,9 мільёна долараў.

***

Аналіз крыві на ўтрыманне забароненага прэпарата эрытраполіэтыну ў Альбервілі рабіцца не будзе. Пра гэта паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі прэзідэнт МАК Хуан Антоніо Самаранч.

Эрытраполіэтын — моцнадзеючы сродак, які дазваляе павялічыць колькасць эрытрацытаў у крыві.

У астатнім, што датычыць допінг-кантролю, усё застаецца па-ранейшаму. Аналізы мачы будуць браць у спартсменаў, заняўшых месцы з першага па чацвёртае, а таксама па жэрабю ў аднаго з застаўшыхся ўдзельнікаў.

***

Адключэнне электрычнасці ў галоўным прэс-цэнтры Алімпіяды ў мястэчку Ла-Лешар — звычайная справа. Кожны дзень «сюрпрыз» чакае журналістаў, як заўсёды, у самы непадыходзячы момант, і таму некаторыя матэрыялы, якія зніклі з экранаў камп'ютэраў, прыходзіцца ствараць двойчы. Арганізатары, праўда, пабяцалі, што ў час «рабочых дзён» Алімпіяды ўсё будзе ў поўнай спраўнасці.

***

Гарачыя тармальных крыніц, якія б'юць у Ла-Лешары, падобна, даходзяць і да галоўнага прэс-цэнтра зімняй Алімпіяды. Журналісты агенцтваў, газет і тэлекампаній, якія арандуюць памяшканні на другім паверсе, задыхаюцца ад спякоты, паколькі будаўнікі забыліся абсталяваць належную вентыляцыю. Расчыненыя дзверы дапамагаюць мала, і таму некаторыя лічаць за лепшае працаваць у калідорах і ў летнім спартыўным адзенні — майках, футболках.

Людзі і цэны

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ж бужаніну. Думаю, дойдзе чарга і да карбанату. Дарэмна нехта лае лібералізацыю цэн. Ёсць у ёй рацыянальнае зерне, ёсць. Хоць бы у асветніцкіх мэтах.

●

Пакуль мамы бавяцца ў чэргах, дзеткі гуляюць у магазін. Сімпатычны сінявокі таўстунчык гадоў пяці імкліва бяжыць да сваёй матулі:

— Дай, мама, візітку, куплю цукерак. Так не прадаюць.

— Ты, хлопча, прасі ўжо адразу і купоны,—раіць дзядзька з чаргі.—Давядзецца яшчэ раз бегчы. Наш гандаль строгі.

«Гандаль» у асобе крыху старэйшай за пакупніка дзяўчынкі сумуе напаказ каля бар'ерчыка ўздоўж магазінай сцяны, раскладушы «мульцікі» ад жавальных гумак. Смешна і сумна: на прыгожым пяшчотным тварыку — той жа выраз, што і ў дарослай цёткі за прылаўкам: абыякава-недаступны і пагардлівы. У якім жа даўгу перад гэтымі дзецьмі ўсе мы...

●

Мудрыя і навучаныя пайшлі пакупнікі: атрымаў талон — адразу атаварвай, а то невядома, што будзе заўтра. Вунь пральны парашок у пачатку месяца каштаваў тры рублі, а за якіх два тыдні ўздаражаў больш як у чатыры разы. Так што трэба браць, пакуль зноў цэны не памянялі. Вядома, дзешавей не будзе.

Чарга гэтак на паўгадзіны. Людзі не губляюць часу даромна. Гэта толькі лайдакі ходзяць на мітынгі і там гадзінамі менцяць языкамі. У чарзе можна спалучыць карысное з прыемным. Не дастаішся, дык хоць душу адвядзеш.

— Усе непарадкі ад гэтых дэмакратаў. Паглядзіце, што робяць. Некаму назвы вуліц не падабаюцца. Ленінскі праспект — так прыгожа! Адкапалі нейкага Скарыну. Ну, ці ж можна параўнаць! Такая велічыня, такі розум, столькі арабіў для нас, а таго, другога, нават ніхто не ведае.—Кабета гадоў пад сорак.

Здраджваю сваёй цвёрдай прывычцы не мітынгаваць у непрыстасаваных для гэтага месцах, асабліва ў чэргах. Але тэма, згадзіцеся, справакавала б любога. А мне ў адказ:

— Бач, разумная! Ленін ёй нядобры. А сама ў футравай шапцы. А хто табе шапку даў? Ленін даў.

Аргумент сапраўды забіўны—як кажуць, напавал. Змаўкаю. А апанентка праз хвілін колькі зноў шчыруе:

— А што гэта за парашок даюць? «Світанак»? Колькі каштуе «Світанак»?

Ці не таму «Світанак», чарга і неймаверныя грошы на яго, што «Скарыну аднекуль аджапалі»?

●

Неяк задумала напісаць рэпартаж, згадаўшы даўнія-даўнія радкі, што ўсплылі ў памяці. Пра тое, як па вуліцы Горкага,—што за паходка! — дзяўчына плыве, што пад ветразем лодка... Прайшлася па нашай тады яшчэ вуліцы Горкага, і нешта расхацелася пісаць рэпартаж: надта ж аднастайныя трапляліся персанажы. Якая там паходка, якія ветразі... Усемагчымыя кайстры, валізкі, скруткі—аж да «караляў» з рулончыкаў туалетнай паперы. Ды ўсё подбегам, ад чаргі да чаргі, ды ўсё даволі бесцырымонна да сустрэчных—«а дзе бралі?»...

Можа, і дарэмна не давяла да канца задуманае, але ж надта сумна зрабілася: вось так і жывём—подбегам, прывыкаем да гэтага. А дзе каралеўская хада, дзе чароўная ўсмешка, прывабная паставa, дзе тое ж паэтава «прычоска —што трэба і світэр — што трэба»? Ці прычакаем?

Напэўна ж, так. Бо інакай дзеля чаго бегаем, мітусімся, забыўшыся на сябе саміх? Як сказаў другі паэт: усё праходзіць, у тым ліку і выпаўшыя нам мукі. І далей:

«Але будзеш мне помніцца ты,—
Броўкі цёмныя, вузкія рукі
І галоўкі радок залаты».

Ці не праўда, харошыя словы, светлыя. Няхай яны спраўдзяцца, і нам запомніцца толькі лепшае ў сваіх блізкіх, у тых, хто сустракаецца ў жыццёвых вірах. Няхай болей будзе на былой вуліцы Горкага прыгожых, грацыёзных дзяўчат і жанчын са светлымі ўсмешлівымі тварамі, лёгкай хадою, з залатымі галоўкамі, якія так упадабаў паэт. Тым болей, што цяпер вуліца носіць ягонае імя.

Людміла РЫЖАНКОВА.

ЗАМЕЖЖА

ЗАБЯСПЕЧАНАЯ СТАРАСЦЬ ПАНІ ЦІТА

Уявіце сабе, да гэтага часу югаславаў вельмі цікавіць лёс былой першай лэдзі Югаславіі, удавы маршала Іосіпа Броз Ціта— Яванкі Броз. Пятнаццаць гадоў назад, яшчэ пры жыцці свайго ўсемагутнага мужа, стаўшы ахвярай палацавых інтрыг, яна вымушана была адысці ў цень і пакінуць бліскучае свецкае жыццё жонкі прэзідэнта тады адзінай краіны.

З таго часу, а асабліва пасля смерці Ціта ў 1980 годзе, яе персона акружана таямнічасцю, прычым таной шчыльнай, што часам прантычна немагчыма адрозніць выдуманае ад рэчаіснасці. Шматлікія спробы журналістаў сустрэцца з ёю былі асуджаны на правал. Не пазбеглі гэтага ў свой час і мы, наіўна разлічваючы атрымаць эксклюзіўнае інтэрв'ю. Відаць, нелюбоў да прадстаўнікоў нашай прафесіі з'явілася ў пані Броз пасля серыі пікантных артыкулаў у мясцовых выданнях, якія галоўным чынам базіраваліся на чутках, часам непрыемных, аб не жыцці з Ціта.

Адну з апошніх сваіх заяў для друку яна зрабіла нават года назад, калі ў Белградзе ішла жорсткая палеміка аб тым, ці варта выносіць саркафаг Ціта з «Дома нветан» — югаславускага маўзалея. Тады яе каментарый быў вельмі кароткі: людзі, якія выступаюць за вынясенне астанкаў не мужа, «дастойным ўсялякай павагі».

Андрэй БАТУРЫН,
Сяргей ГРЫЗУНОЎ,
РІА «Навіны».

Белград.

ДЫЯЛОГ З ФІНІНСПЕКТАРАМІ

Статыстычныя даныя сведчаць, што за апошнія 40 гадоў зарплата ў ФРГ узрасла ў 14 разоў, а падаткі — у 50. У 1990 годзе іх сума склала 550 млрд. марак.

У час гутаркі ў Федэральным статыстычным упраўленні з кіраўніком аднаго з аддзелаў па пытаннях падаткаабкладання я спрабаваў высветліць сярэднямесячную заработную плату ў краіне. Мой субяседнік вываліў на мяне мноства статыстычных даных, якія датычацца даходаў прамысловых рабочых і дзяржаўных служачых, рамеснікаў і прадпрымальнікаў у новых і старых землях Германіі. Вырашылі спыніцца на даходах прамысловых рабочых у старых землях. Іх штомесячная сярэдняя заработная плата складае 3.711 марак. Падаткі і выплаты па сацыяльнаму страхаванню дасягаюць прыкладна 33 працэнтаў.

Любому грамадзяніну ФРГ прыходзіцца рабіць больш 50 розных адлічэнняў. Самыя вялікія паступленні дае казне падатак на зарплату і прыбытчаны кошт. Робячы любую пакупку, вы даплачваеце 14 працэнтаў кошту тавару.

На трэцім месцы — паступленні ад даходаў прадпрыемстваў, фірм, магазінаў, атэляў, банкаў, рамеснікаў, людзей свабодных прафесій.

Аб неаперацыйным спосабе выдалення камянёў з нырак паведамляе венгерскае інфармацыйнае агенцтва МТІ.

*На працягу трох дз

АДКРЫТЫ РАХУНАК БЗВ

У дзейнасці Беларускага згуртавання вайскоўцаў адбылася значная падзея. Адкрыты банкаўскі рахунак арганізацыі. Пакуль што на ім — невялікая сума складак сяброў БЗВ. Але ў кіраўніцтва арганізацыі ёсць меркаванне, што грашовую падмогу БЗВ змогуць аказаць прафсаюзныя арганізацыі, свядомыя, заклапочаныя ў нацыянальным Адраджэнні, камерсанты, дзяржаўныя структуры.

У першую чаргу, лічыць кіраўніцтва БЗВ, грошы пойдуць на клопаты па патрыятычнаму выхаванню моладзі — заўтрашніх абаронцаў Айчыны.

Падказваем рахунак БЗВ: г. Мінск, камерцыйны банк «Дукат», Беларускае згуртаванне вайскоўцаў, 700210 МФО 153001767.

К. ЛАДУЦЬКА.

Dainova Ltd.

У НАС ДЛЯ ВАС—

ТЭХНІКА, ЯКАЯ ДАБАВІЦЬ ПРЭСТЫЖУ ВАШАЙ ФІРМЕ І ДАДАСЦЬ КАМФОРТУ Ў ПРАЦЫ

● персанальныя камп'ютэры
● прынтэры (фармат А4)
● плотэры (фармат А4)
● тэлефаксы
● ксераксы
● аўтаадказчыкі

● радыётэлефоны фірмы «SNC» (10 нумароў памяці, селектарная сувязь, радыус дзеяння — 500 м).

БУХГАЛТАРАМ І БАНКІРАМ «ДАЙНОВА» ПРАПАНУЕ 12-разрадныя калькулятары з друкуючым прыстасаваннем і двухколерным друкам фірмы «CASIO».

◆ ДАКЛАДНА Ў ТЭРМІН
◆ ЗА РУБЛІ
◆ ПА ФАКТУ АПЛАТЫ

Адрас: 220600, г. Мінск, вул. Прытыцкага, 60/2-129 Тэл. 58-87-04.

НЕАДКЛАДНАЯ ПАСТАЎКА СА СКЛАДА Ў МІНСКУ

МІТЫНГОВАЯ АПОВЕСЦЬ

Уладзімір ДАМАШЭВІЧ

(Працяг. Пачатак у №№ 25—27).

Парэпка разам з Хведарам Слабковым паволі, але няўхільна прыбліжаліся да ўваходу на могілкі, дзе ад жалезнае крытае брамы ў два бакі адыходзяць, як два крылы, бетонныя, у рост чалавека, панелі-бардзюры, на якіх ужо злева і справа стаялі фатографы, некаторыя нават усцягнулі свае трыногі-штатывы, былі і людзі з кінакамерамі, хоць на іх увесь час накрывалі знізу міліцэйскія начальнікі з мегафонамі, прасілі і патрабавалі, каб яны спускаліся на зямлю. Аднак жа іх каманда прападала без адказу, і тады міліцыянеры пачалі сцягваць людзей за ногі. Мала таго, там апынулася яшчэ нямала моладзі са сцягамі, з транспарантамі — іх таксама сцягвалі ўніз раззлаваныя не на жарт міліцыянеры.

Ля ўваходу на могілкі, як сцяна, стаяла ў нескалькі шарэнгаў міліцыя, побач з імі — іх камандзіры, некалькі вышэйшых афіцэрскіх чыноў з мегафонамі — яны хадзілі між натоўпу і заклікалі разысціся, «не траціць дарагога часу». На могілкі, гаварылі яны, нікога не пусцяць, такі прыйшоў загад.

У натоўпе сям-там Парэпку трапляліся знаёмыя твары — то хто па рабоце, па Саюзу пісьменнікаў, то які аўтар, што прыносіў вершы ў рэдакцыю.

Вось да іх падышоў не так высокі, як мажны, з магутнымі пакатымі плячыма малады мужчына. Парэпка ведаў яго — прозвішча яго было Стасевіч, ён прыносіў у рэдакцыю свае першыя апавяданні, яны былі надрукаваны, Парэпка чытаў іх, і яны яму спадабаліся. Стасевіч, як большасць людзей такога фізічнага складу, быў павольны, разважлівы і спакойны чалавек.

Парэпка пазнаёміў Стасевіча са шваграм. Той глянуў на хлопца знізу ўверх, крыва ўсміхнуўся— адным краем вуснаў — і сказаў:

— О, цяпер мы смелыя. Як за каменнаю сцяною. Пойдзем разам?

— А чаму ж не? —адказаў Стасевіч. — Я тут у натоўпе згубіў сябра, то пайду з вамі.

— А куды пойдзем? — зноў спытаўся Парэпка. — Хіба мы не прыйшлі?

І толькі ён так спытаўся, як справа ў натоўпе пачуліся крыкі:

— На Курапаты! На Курапаты! Ідзём на Курапаты!

І ў натоўпе замахалі бела-чырвона-белымі сцягамі, як бы запрашаючы да руху, паказваючы яго кірунак.

Паступова Парэпкам авалодвала пачуццё, знаёмае па мітынгах, зборах і сходах, якія цяпер здараліся часта: ён сам быў актывістам БНФ, «Мартыралога Беларусі», Таварыства беларускай мовы, — і часта быў сярод натоўпаў людзей, аб'яднаных адною ідэяй — адраджэння Бацькаўшчыны. Яго ахоплівала тады пачуццё ўпэўненасці ў сваіх сілах, пачуццё еднасці з тымі людзьмі, якія былі навокал яго, бо гэта былі свае людзі, пераважна беларусы, пераважна ўсе яны гаварылі на роднай мове, і было прыемна чуць побач родную мову, яна лашчыла яму слых, як музыка.

Натоўп, як агромністая ільдзіна, паволі расколваўся на дзве часткі: левая, прыпёртая да жалезнай агароджы могілак шпалерамі міліцыі і курсантаў, павагаўшыся, засталася на месцы, а правая, паволі выцягваючыся, цяснімая з абодвух бакоў шарэнгамі міліцыі, паволі перастройвалася ў калону, абазначаўшы свой фарватэр транспарантамі і бела-чырвона-белымі сцягамі.

Там, недзе ў галаве гэтай калоны, ішоў лідэр БНФ Юзік Стэльмах, прызнаны ўсімі кіраўнік новых сіл, што аб'ядналіся пад сцягам адраджэння, у абарону перабудовы. Ён ужо меў шмат ворагаў, усе яны, як маглі, аблівалі яго брудам, няславілі, называлі фашыстам, антысаветчыкам, экстрэмістам, — як яго толькі не называлі!

Але варта было яго паслухаць адзін раз, як усё тое, што на яго вярнулі і лілі, нібы само сабою адпадала, не пакідаючы следу: перад табою быў шчыры патрыёт Беларусі, які хоча ёй дабра, дабра для яе народа.

...Абмінуўшы справа Маскоўскія могілкі, калона рушыла полем і сцежкамі проста на Курапаты. Тут пагоркі, нізіны, перакаты, калона расцягнулася на дзве вярсты ці болей. Відаць дарога злева, па якой бягуць адна за адной машыны. Але што гэта? Машыны не простыя, не цывільныя. Гэта міліцэйскія машыны з мігалкамі, яны едуць туды, куды кіруе калона — на Курапаты. Едуць і «хуткія дапамогі», і аўтобусы-фургоны з закратаванымі вокнамі. Значыць, іх будуць чакаць на ўваходзе ў лес. Мо нават не будуць пускаць. Мо нават будуць сустракаць палкамі — разганяць...

І Юзік Стэльмах робіць хітры ход: ён спыняе калону сярод поля, на пагорку, і аб'яўляе, што далей ісці няма сэнсу, бо іх там будзе чакаць міліцыя ў засадзе, і чым усё скончыцца — невядома. Ёсць сэнс спыніцца тут і правесці жалобны мітынг.

І людзі згадзіліся. Паволі з калоны ўтварылася вялізнае кола, якое згрупавалася вакол цэнтра, у якім быў Юзік Стэльмах і некалькі яго сяброў, што ўцалелі ад арышту, былі сцягі і транспаранты.

Мегафона не было, і Стэльмах звярнуўся да ўсіх так, як гавораць не з трыбуны, а як гаворыць чалавек з чалавекам проста і шчыра, без лішняга пафасу.

— Шаноўная грамада! Вы бачыце, што нам не даюць рабіць мінімальнае з таго, што можа і павінен рабіць кожны народ у сваім доме, на сваёй зямлі. Мы тут не як гаспадары, а як пасынкі. Розніца з тым, што было не так даўно, што нас не страляюць і не кідаюць у ямы, як гэта рабілі да вайны вось у тым недалёкім лесе, у які мы ішлі, каб запаліць свечкі і памянуць душы нявінных ахвяр сталінскага генацыду. Прашу запаліць свечкі, у каго ёсць... Свечка — сімвал нашага жыцця. Яна гарыць так жа хутка, як праходзіць для вечнасці наша жыццё... Сёння мы запалілі гэтыя свечкі за душы нашых суайчыннікаў, што склалі свае нявінныя галовы ў Курапатах, за душы тых, хто жыў да нас, хто пакінуў нам надзею на лепшае заўтра, якое мы павінны рабіць, будаваць сёння. Ім было цяжка, але яны не адступалі, яны верылі, што ідуць правільнаю дарогай і што перамога будзе на іх баку. Шмат хто з іх памерлі з гэтаю святою верай, шмат хто расчараваўся, шмат хто пракляў тое, у што верыў... У што ж сёння верыць нам, што нясём свой нялёгкі крыж? У тых, што сёння накіравалі па нашых слядах міліцэйскія батальёны, што па-ранейшаму лічаць нас нацыяналістамі, ворагамі свайго народа і сваёй зямлі? Не, у тых мы ўжо даўно не верылі і не верым.

— А добра гаворыць, — штурхнуў локцем Парэпку шваг Слабкоў. — Шчырую праўду кажа...

Парэпка кіўнуў — сапраўды, словы Стэльмаха знаходзілі ў яго душы свой водгук, абуджалі эмоцыі, якія не так ужо і часта хтонебудзь мог закрануць, што называецца, перавярнуць душу. А Стэльмах сваім шчырым словам гэта зрабіў — і, відаць, не толькі ў свядомасці Парэпкі ці Слабкова. Моладзь успрымала яго яшчэ больш блізка, прачула, гатова была за ім у агонь і ў ваду.

Выступала нейкая бялявая дзяўчына, чытала свой верш. Звычайны, не асаблівы, не напісаны вось для гэтай хвіліны, але з роздумам пра наша нядаўняе і тое, што мы маем сёння. Ён уражваў і кранаў усіх, хто стаяў тут пад сцягамі «Пагоні», хто прыйшоў ушанаваць памяць сваіх продкаў — дзядоў:

Дайце мне быць беларусам —
Усяго толькі, не болей.
Бо цяжка жыць пад прымусам,
Абдзеленым доляй і воляй.
Куды наша мова прапала?
Каму яна лішняй здалася?
Нібыта не жыў наш Купала,
І песня яго не лілася?
Было ў нас усё на славу,
Ды неяк няўзнак пазнікала:
Мудрае Коласа слова,
Прароцкае слова Купалы...

— Ты глядзі на тую горку, што справа ад нас,—зноў штурхнуў Парэпку шваг, як толькі дзяўчына скончыла чытаць верш. — Там жа міліцыя, і яна нешта падазрона нацэлена на нас.

Міхась Парэпка ўжо колькі часу бачыў там рух міліцыянераў, іх мо рота ці болей, нешта яны стаялі строем, а потым змяшаліся, нешта падобнае, як самі мітынгавалі. Ужо добра тое, што не ўмешваліся.

— Хай глядзяць, абы не чапляліся да нас,— адказаў Парэпка.

— Не для таго іх прыгналі сюды, каб яны стаялі і мерзлі. Яны зараз пачнуць грэцца, вось пабачыш, — выказваў здагадкі Слабкоў.

Малады барадаты высокі мужчына стаў гаварыць пра тое, як вякамі знішчалі нашу нацыянальную свядомасць, як заўсёды лепшых людзей нацыі або хацелі купіць, перацягнуць на бок дужэйшых, або знішчалі, калі тыя не хацелі прадаваць інтарэсы свайго народа.

І тут раптам ён змоўк, азірнуўся: да людзей даляцеў гул — нібы зусім блізка імчаўся табун дзікіх коней — аж дрыжала ўмерзлая звонкая скарынка зямлі. І ўслед пачуўся моцны камандзірскі голас:

— Детей не топтать!

Усе з жахам пазіралі і бачылі: на іх лавінай, рассыпаўшыся па полі, імчаў мо цэлы батальён міліцыі з доўгімі палкамі ў руках.

—Не ўцякаць! Будзем стаяць на месцы! Мы не злачынцы! — крыкнуў, перакрываючы тупат ног, Стэльмах і ўзняў угару руку.

Але інстынкт самазахавання мацнейшы за ўсе чалавечыя пачуцці: многія, асабліва крайнія, кінуліся наўцёкі, са страхам чакаючы набліжэння міліцыі і непазбежных ударaў.

І вось яны ўварваліся, урэзаліся ў натоўп, збіваючы з ног ударамі цел і палак тых, што стаялі з краю, даганяючы тых, што ўцякалі, і б'ючы іх на хаду направа і налева, не разбіраючы ні галавы, ні плячэй. Крыкі роспачы, дзікі лямант і плач запоўніў усё поле.

Міліцыянеры адбіралі транспаранты і сцягі, ламалі дрэўкі, раздзіралі і тапталі палотнішчы. І рабілі гэта з вялікім імпэтам, старанна, нібы выконвалі вунь якую важную работу, а лепш сказаць — адказную.

Гледзячы на ўсё гэта, Міхась Парэпка прыйшоў у нейкі дзікі шал. Здаецца, каб была ў яго шабля, ён цяпер, не задумваючыся, кінуўся б у гушчу тых, што беглі з палкамі, і сёк бы, не разбіраючы, налева і направа, як яны цяпер малацілі сваімі палкамі, каб аж ляцелі іхнія галовы, бо гэта было нясцерпна, невыносна глядзець, як дужыя адкормленыя дзецюкі накідваюцца на ні ў чым не вінаватых людзей — жанчын і дзяўчат, хлопцаў і ўжо ў гадах людзей, нават на тых жа дзяцей, якіх было загадана «не топтать».

(Працяг будзе).

РАНІЦА ДЗЕЛАВОГА ЧАЛАВЕКА

Парады дае кандыдат медыцынскіх навук Павел САКАЛОЎ, —спецыяліст па нялекавых метадах тэрапіі, аўтар 90 навуковых і 35 папулярных публікацый.

ДЗЕНЬ ТРЭБА ПАЧЫНАЦЬ упэўненым у сабе, дужым і добрым. Вядома, многае залежыць ад таго, як быў праведзены ўчарашні вечар, ноч; але галоўнае ўсё ж — умение ўстаць раніцай з «правай нагі». Хутка, эфектыўна і дакладна пераключыць свой арганізм з начнога рэжыму работы на дзённы. Правільна запусціць чарговы цыкл сутачнага біярытму. Трэба зрабіць так, каб бадзёрасці хапіла на цэлы дзень. Першай справай зарадка? Мы да гэтага прывыклі. Аднак сучаснымі даследаваннямі даказана, што сілавую гімнастыку лепш адкласці да сярэдзіны ці другой палавіны дня. Па-першае, яна займае дастаткова шмат часу, па-другое, ваш арганізм яшчэ не гатоў да значнай фізічнай нагрузкі.

З майго пункту погляду, раніца мужчыны павінна выглядаць наступным чынам. Прачнуўшыся, павярнуўшыся на спіну, паклаўшы рукі ўздоўж цела далонямі на пасцель. Напружыцеся, апёршыся рукамі, пяткамі і патыліцай, злёгку прагніцеся, прыўзняўшы таз. Адчуйце сваё цела. Расслабцеся, крыху паляжыце спакойна і ўставайце. Вызваліце мачавы пузыр і кішэчнік. Памыйцеся, завяршыўшы туалет халодным душам. Адчыніце вокны ці, калі на вуліцы халодна, фортку. А цяпер, павярнуўшыся тварам на ўсход, зрабіце комплекс «Добры дзень, Сонца!» Гэты комплекс — ранішняя размінка ёгаў. Яго звычайна выконваюць на досвітку, павярнуўшыся тварам да ўзыходзячага Сонца. Канешне, я не збіраюся патрабаваць ад нашага чытача так рана ўставаць, калі яго арганізм прывучаны да іншага рэжыму. Але ўсё ж практыкаванні комплексу трэба выконваць у пачатку дня, як толькі прачнуліся, павярнуўшыся тварам да Сонца, няхай яно нават паднялося ўжо над гарызонтам.

Ёсць поўны, вялікі комплекс «прафесіянальных» ёгаў, але вы можаце карыстацца і скарочаным варыянтам, калі баіцеся спазніцца на работу ці не лічыце сябе дастаткова падрыхтаваным фізічна.

Поўны комплекс «Дзень добры, Сонца!»

Практыкаванні трэба рабіць басанож, і пажадана, каб адзення на вас было як мага меней. Комплекс пачынаеце ў прамой стойцы з рукамі, складзенымі на грудзях (1). Пяткі і наскі ног разам. Павольна і свабодна дыхаючы, забудзьцеся на ўсе клопаты вашага жыцця. Сканцэнтруйцеся на Сонцы, нават калі яго і не відаць за аблокамі. Імкніцеся ўнутрана адчуць яго цяпло, думкамі аб'яднайцеся з Сонцам, нагадайце сабе, што вы, як і ўсё жывое на Зямлі, — яго дзіця. Пачаўшы павольны ўдых, узніміце рукі ўгору, прагніцеся з выцягнутымі рукамі (2). Затрымайце дыханне на 2—3 сек., гэта другая фаза практыкавання. У гэты час старайцеся адчуць сваё цела дугой туга нацягнутага лука, пругкай і гатовай выкінуць стралу вашай энергіі ў будучы дзень. Трэцяя фаза: пачаўшы выдых, нахіляйцеся наперад, пакуль не дакранецеся рукамі да падлогі, пры гэтым ілбом трэба дастаць калені, не згінаючы іх (3). Зноў затрымайце дыханне на 2—3 секунды. Сканцэнтруйцеся, адчуйце сябе маленькім і пругкім шарыкам, добра абароненым, лёгка адбіваючым знешнія ўдары. Зрабіце ўдых. У чацвёртай фазе, не мяняючы становішча рук (вы помніце, што яны ў вас дакранаюцца да падлогі?), адстаўце правую нагу далёка назад. Левую — выстаўце наперад, сагнуўшы яе ў калене. Пры гэтым тулава павінна прыняць вертыкальнае становішча, галаву падыміце, глядзіце наперад (4). Затрымайце дыханне на вышыні ўдыху. Сканцэнтруйцеся на пругкасці ног, на вашым пазваночніку. Ён такі прамы: галава, шыя і спіна — усё выцягнута ў адну струну. Адчуйце яе энергію! Выконваючы пятую фазу поўнага комплексу, перанясіце левую нагу назад; няхай яна будзе побач з правай, у такім жа становішчы (абедзве прамыя нагі разам, пальцы і пяткі таксама). Выпрастайце цела, абапрыцеся на прамыя рукі (5). Пасля гэтага, робячы выдых, павольна сагніце рукі. Скончыць выдых трэба, лежачы на падлозе (шостая фаза), не расслабляючыся, так, каб да падлогі дакраналіся толькі пальцы ног, калені, грудзі, лоб (не ўвесь твар) і далоні рук (6). Выконваючы гэту фазу комплексу, нібы зліцеся з Зямлёй, адчуйце яе сілу, надзейнасць. Увесь астатні час імкніцеся фіксаваць сваю ўвагу на Сонцы, вялікай крыніцы энергіі, сілы і бадзёрасці, якое дорыць жыццё ўсім істотам на Зямлі, песціць нашу планету і скіроўвае свае жыватворныя промні і на вас. Гэта адчуванне павінна захоўвацца ўвесь час, пакуль вы выконваеце комплекс «Дзень добры, Сонца!». Пасля гэтага пачніце ўдых. Лежачы на жываце, узніміце галаву і грудзі (7), адначасова прагінаючыся і робячы пры гэтым ўдых. У наступнай фазе вам давядзецца прыняць позу, якая збоку можа здацца дзіўнай. Узніміце таз так, каб рукі і корпус складалі адзін бок трохвугольніка, а прамыя ў каленях ногі — другі (8). Затрымайце дыханне на вышыні ўдыху і адначасова пачніце дзевятую фазу комплексу: выстаўце сагнутую правую нагу наперад паміж рукамі, упёршыся каленам другой нагі ў падлогу. Прагніцеся, падыміце галаву (9). Толькі пасля гэтага пачніце выдых. Для пераходу да дзесятай фазы прыстаўце левую нагу да правай; працягваючы апірацца на прамыя рукі, што дакранаюцца да падлогі, разагніце калені, прыўзніміце таз так, каб, стоячы на прамых нагах і не адрываючы далоняў ад падлогі, дакрануцца лбом да каленяў выпрастаных ног (10). Скончыўшы выдых, затрымайце дыханне на 2—3 секунды. Пачніце разгінацца, пры гэтым робіце ўдых. Выпрастаўшыся з паднятымі рукамі, прагніцеся (11). Затрымайце дыханне. Наступная фаза: складзіце рукі на грудзях (12) і зрабіце некалькі глыбокіх і павольных поўных дыхальных рухаў. Вы павінны адчуваць, як ваша цела напоўнілася свабодна цыркулюючай па ім энергіяй Сонца. Адчуванне павінна быць светлае, радаснае.

РАДЫЁ

12 лютага

10.15 — для дзяцей. А. Дударэў. «Блакітны праменьчык». Інсцэніраваная казка. 10.35 — «Агеньчык». Радыёклуб. 11.20— «Па шляху да рынку». 11.40 — «З новых запісаў». Іграе скрыпач А. Рылатка. 12.00—«Апоўдні». Перадача на актуальныя тэмы. 13.00 — «У абедзенны перапынак». 14.00 — «Парад зорак». Эстрадная праграма. 15.15 — «Маленькія шедэўры вялікіх кампазітараў». Музычная праграма. 16.05— М. Лынькоў. «Андрэй Лятун». Апавяданне. 16.33 — канцэрт. 17.00— «У свеце аперэты». Канцэрт. 18.00 — перадачы абласнога радыё. 19.00 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45 — вячэрняя казка. 20.00— «Дзень нашага жыцця». 20.25— У. Дзюба. «Нарачным. Рукевічу. Рылееў...». Радыёспектакль. 21.40 — вершы А. Пысіна. 22.00 — Л. Гаўрылюк. «У той далёкі год». Апавяданне. 22.30 — «У суладдзі з паэзіяй». Канцэрт класічнай музыкі. 23.10 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 23.55 — «Начны канал».

НА ДВОР'Е

11 лютага

Сёння ўдзень па рэспубліцы пройдуць ападкі. Тэмпература паветра ў Віцебску, Магілёве — 0—2, Гомелі, Мінску, Гродна — 1—3, Брэсце — 2—4 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак характар надвор'я істотна не зменіцца.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Саюзная і рэспубліканская інфармацыя.
«Неаплачаныя вэксалі». Працягваем размову.
«Чытач — чытачу». Пісьмы ў «СБ».
«Здароўе — катэгорыя знаменічная». Фотарэпартаж.
«Кругагляд». Людзі. Падзеі. Факты.
«Кветкі на магілу святара». Лёсы людскія.
«Мяса ў... яму». Вострыя сігнал.
«Чалавек — дзіця космасу». Гутарка з астролагам.
«Яны не без вестак прапалі...». Памяць.
«Лякарства ад старасці». Дарэмна забытае.
«Дыверсія на ігналінскай АЭС». У нашых суседзяў.
«Золата Любові Ягоравай». Дзённік Алімпіяды.

Рэдакцыі газеты «Звязда» на пастаянную работу патрабуецца галоўны бухгалтар. Звяртацца па адрасу: г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77, тэлефоны: 32-35-91, 32-51-05.

«СПОРТЛАТО»

Вынікі 6-га тыражу.
«Шэсць з 45».
5—15—20—24—27—33.
«Пяць з 36».
1—10—12—26—32.

18 і 25 ЛЮТАГА 1992 ГОДА ў г. МІНСКУ
вул. Кастрычніцкая, 5
З 10.00 ДА 18.00

АДБУДЗЕЦЦА СЕМІНАР

па пытаннях падаткаабкладання і цэнаўтварэння ў адпаведнасці з новым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь

УДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ ВЯДУЧЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ МІНІСТЭРСТВА ФІНАНСАЎ, ПАДАТКОВАЙ ІНСПЕКЦЫІ, ДЗЯРЖЭКАНОМПЛАНА.

Удзельнікі семінара забяспечваюцца апошнімі нарматыўнымі дакументамі і метадычнымі матэрыяламі.

Для ўдзелу ў семінары неабходна пералічыць 500 рублёў на разліковы рахунак № 1345509 у Камерцыйным банку «Беларусь», код банка 153001, МФО 795, **зарэгістраваць свой удзел па тэлефонах: 24-24-09, 80-46-76.**

ТЭЛЕБАЧАННЕ

11 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Тандыр, арча, агонь...» Кінанарыс.
9.00. Музыка і спевы. 5-ы клас.
9.30. «Светлая асоба». Мастацкі фільм.
10.50. «Гаючая душа». Тэленарыс пра селяніна з Гродзеншчыны У. Купрыяновіча.
11.25. «Ад і да». Тэлетаргі.
11.40. «Каханнем за каханне». Мастацкі фільм.
16.30. Навіны.
16.35. Прыродазнаўства. 3-ці клас.
16.55. Выступленне Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам А. Лысенкі і выхаванцаў музычнага ліцэя пры Беларускай кансерваторыі.
17.45. «Серабрысты зраночак». Мультфільм.
18.00. Фільмы «Незнаёмы і дзівосны свет», «І расказала возера».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Віцебск).
19.35. Наш каментарый. «Як падзяліць непадзельнае?»
19.40. Сацыяльная абарона працоўных. У перапынку (20.25)— Калыханка.
21.20. Тэлебіржа.
21.35. «Кін-дза-дза!» Мастацкі фільм. У перапынку (22.40) — НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Лянота». Мультфільм.
7.50. Канцэрт З. Вірсаладзе (фартэпіяна).
8.45. «Палата нумар шэсць». Тэлеспектакль.
10.15. Дак. фільм «Дэльта».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Рытмічная гімнастыка.
11.50. Свята танцора ў г. Уладзіміры.
12.50. «Матч-рэванш». Мультфільм.
13.10. С. Франк. Харал № 3 для органа ля мінор.
13.25. Гандлёвы рад.
13.45. «Вам гэта трэба?»
14.00. Навіны.
14.20. Урокі Вольгі Івановай.
14.35. «Станцыйны наглядчык». Мастацкі фільм.
15.40. «Лясныя казкі». Мультфільм.
15.55. Выступае Рашыда Ідрысава.
16.10. Разам з чэмпіёнамі.
16.25. Зімнія алімпійскія гульні. Санны спорт.
17.00. Навіны.
17.20. Неастралагічны прагноз.
17.40. Мультфільм.
17.55. «Справа».
18.15. Фільмы рэжысёра Г. Дакелі. «Афоня».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Тэлевізійнае знаёмства». Урмас От гутарыць з Прэзідэнтам Украіны Л. Краўчуком.
21.30. «Фермата». Музычна-інфармацыйная праграма.
22.00. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная ЗША—зборная Германіі. У перапынку (23.00)— Навіны.
0.20. «Ваш выхад, артыст». Я. Ласько.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Французская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Птушкі побач з намі».
8.05. Французская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Прастора плюс.
9.05. Сялянскае пытанне.
9.25. Дзённік Алімпіяды.
10.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам французкай мовы).
11.00. Пятае кола.
12.45. «Бязмежжа на «Барыкаднай».
13.00. Весткі.
15.00. Зімнія алімпійскія гульні. Біятлон.
16.30. Т. Ін. Ка.
16.45. Зімнія алімпійскія гульні. Двяборства. Слаломы.
18.40. Парламенцкі веснік Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Сам сабе ражысёр». Перадача 2-я.
20.05. Дзённік Алімпіяды.
20.25. Грамадская думка.
20.40. Люстры.
21.10. Аўташоу.
21.40. Дзелавы кур'ер.
22.00. Весткі.
22.25. Зімнія алімпійскія гульні. Фігурнае катанне.

12 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Вольны табун». Кінанарыс.
9.00. Прыродазнаўства. 3-ці клас.
9.20. Ліра.
11.30. «Кін-дза-дза!». Мастацкі фільм.
16.30. Навіны.
16.35. Для дзяцей. «Тое-сёе з паштовай сумкі».
17.15. Экран дзіцячага фільма. «Кукурыгу», «Дарога дамоў».
18.00. Дак. фільмы «Два словы ў пісьме», «Галасы».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. «Прадбачанне і рэальнасць».
19.40. Аб партыях—без дыпламатыі. Шматпартыйнасць: знаходкі і страты.
20.25. Калыханка.
21.05. «Забіць дракона». Мастацкі фільм.
23.05. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Мультфільмы «Скарб», «Крот і жавальная гумка», «Кот у ботах».
8.10. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная ЗША — зборная Германіі.
9.30. Разам з чэмпіёнамі.
9.45. Фільм—дзецям. «Як Хашым быў вялікім».
10.50. Народныя мелодыі.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Погляд з правінцыі». Зямля варонежская.
12.10. Паралельныя сусветы.
12.55. Як дабіцца поспеху.
13.15. Тэлеміст.
14.00. Навіны.
14.20. Сёння і тады.
14.50. «У бары бруснічы». Мастацкі фільм. 1-я серыя «Незамужняя жонка».
16.10. «Гісторыя без слоў». Мультфільм.
16.15. Зімнія алімпійскія гульні. Санны спорт.
17.00. Навіны.
17.20. Рэформа: тыдзень за тыднем.
18.00. Зімнія алімпійскія гульні. Фігурнае катанне.
18.55. Мастацкі фільм «Дайце мне спяваць».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Зімнія алімпійскія гульні. Канькабежны спорт.
21.10. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная СНД — зборная Чэхіі-Славакіі. У перапынку — Навіны.
23.45. Музычны прагноз.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Увага, здымаю!»
8.05. Нямецкая мова. 2-гі год навучання.
8.35. «Карэту мне, карэту!», Творчы партрэт В. Саломіна.
9.35. Дзённік Алімпіяды.
10.15. Расійскі фермер: погляд у будучыню.
11.00. Зімнія алімпійскія гульні. Біятлон.
13.00. Весткі.
15.00. Восень жыцця.
15.20. Зімнія алімпійскія гульні. Двяборства.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Зімнія алімпійскія гульні. Горныя лыжы.
18.00. Грані.
18.40. Азы кар'еры.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.00. Дзённік Алімпіяды.
20.30. Тварам да Расіі.
20.50. Мультфільм.
21.00. «Так, прэзідэнт. Не, прэзідэнт».
22.20. «Пецярбургскі міф». Перадача 1-я.
23.00. «Біг-бенд Джэфарда Холмса».

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў—32-04-52, 32-41-92, навін—32-15-02, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

ПА НУМАРУ ДЗЯЖУРЫЛІ: член рэдакцыйнай калегіі Яраслаў Чапля, першы намеснік адказнага сакратара Яўген Ляхаў, старшы карэктар Ала Сабалеўская.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкуецца са скарачэннямі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Тыраж 81.098. Індэкс 63850. Зак. № 28. Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 21.05.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12